Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ВЕРАСНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 182
(26295)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Каб жыла наша мова

Ліст у нумар

...Гадоў з 20 ужо пастаянна выпісваю «Звязду», кожны нумар чакаю, хоць чытаю, мо, і не адразу.

Але ж каб прыйшоў, каб у хаце быў, — мне трэба. Інакш — нечага не хапае. Прычым — вельмі істотнага.

Таму і не люблю святы — дні, калі не выходзіць газета.

Што прыкмячаю, калі выходзіць, калі чытаю? Многае. І, зразумела ж, тое, колькім людзям не абыякавы лёс роднай мовы! Аб ім пішуць вершы, аб ім — трывожныя лісты...

Гэта — добра, але, як мне здаецца, сягоння — мала: трэба рабіць і іншыя захады. Асабліва — калі ёсць дзеці, калі ёсць каму перадаць гэты скарб пад назваю родная мова і тым самым падоўжыць яе жыццё. Тут, мне здаецца, нават бацькоўскі аўтарытэт свой трэба ўжыць — прымусіць уласных дзяцей паважаць сваю мову, гаварыць і чытаць на ёй — карыстацца. Хто, калі не яны? Хто, калі не мы?

За сябе магу сказаць, што за мову, за адзіную беларускамоўную «Звязду» агітую многіх — больш чым 10 чалавек загітавала, каб падпісаліся. Асобныя, як, напэўна, і трэба было чакаць, не больш, чым на квартал. Але ж у асобных, як мінімум у пяці чалавек, гэта — ужо на жыццё. Я ганаруся імі!

Асабліва апошняй... На «Звязду» прапанавала падпісацца яшчэ школьнай сваёй прыяцельцы. Яна доўгі час жыла ў Расіі, потым вярнулася. Мяне ўразіла, як яна прыняла газету — душою, з першых нумароў — за адну толькі мову!

Што цікава, муж гэтай прыяцелькі спачатку спрабаваў пярэчыць — чытаў і выпісваў рускамоўныя выданні. А яна — не, трымалася свайго, на сямейны бюджэт усё роўна «вешала» «Звязду»...

І нарэшце ён здаўся: уласнаручна запоўніў квіток аб падпісцы і падарыў яго жонцы на дзень народзінаў... Гэта значыць, ён, рускі, зразумеў, як важна ёй роднае слова. А мы?

Што маем — не цэнім.

Дарэчы, я з гэтага ўчынку зрабіла свае высновы: уперад старалася загітаваць сваіх блізкіх, сваіх сяброў падпісацца на газету. Цяпер — буду дарыць квіток.

Ведаю, сярод чытачоў, нас вось такіх фанатаў «Звязды», не так ужо і шмат — працэнтаў мо 20 ад агульнай колькасці. Але ж, калі кожны з нас пасвяціць у падпісчыкі хоць бы аднаго чалавека, а потым той адзін яшчэ аднаго, мова зажыве! Ці не так?

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

Тэлефонная размова з Прэзідэнтам Беларусі адбылася па ініцыятыве Х. Саланы

Тэлефонная размова Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Вярхоўнага прадстаўніка Еўрапейскага саюза па пытаннях знешняй палітыкі і палітыкі бяспекі Хаўера Саланы 24 верасня адбылася па ініцыятыве апошняга.

У ходзе размовы быў абмеркаваны шэраг пытанняў, што датычацца развіцця ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў Беларусі, а таксама ўсяго спектра супрацоўніцтва нашай краіны з Еўрасаюзам. Была падкрэслена важнасць адкрыцця новай старонкі ў адносінах Беларусі і ЕС.

Аляксандр Лукашэнка і Хаўер Салана дамовіліся аб прадаўжэнні пачатага дыялога пасля вяртання Вярхоўнага прадстаўніка з Нью-Ёрка, дзе ён прымае ўдзел у сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

БЕЛТА.



Фота Пятра ФАМІНА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

З НЯДЗЕЛІ ПАЧНУЦЦА ДАЖДЖЫ

У пятніцу і суботу на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць бабіна лета, калі захаваецца сонечнае і цёплае надвор'е, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.

У гэтыя два дні ўначы і раніцай месцамі будзе назірацца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы 2—7 цяпла, у асобных раёнах на глебе замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень — 12—18 градусаў.

Аднак у нядзелю характар надвор'я істотна зменіцца пад уплывам цыклонаў з боку Атлантыкі. Стане пахмурна і даволі вільготна. У нядзелю ўначы па паўночным усходзе, а ў дзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 5—10 цяпла, удзень — 8—13, па поўдні да плюс 17 градусаў. У панядзелак працяглыя восеньскія дажджы будуць назірацца па ўсёй тэрыторыі краіны, у аўторак ападкі чакаюцца месцамі, у сераду — зноў моцныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы 3—9, удзень — 6—12 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, першыя 5 дзён кастрычніка будуць даволі дажджлівымі, потым на працягу тыдня прагназуецца істотнае пахаладанне. Разам з тым прыкладна ў сярэдзіне кастрычніка чакаецца некалькі цёплых сонечных дзён трэцяй, апошняй хвалі бабінага лета.

Сяргей КУРКАЧ.

У ДТЗ ТРАПІЛІ ТРОЕ ПЕШАХОДАЎ

На дарозе паблізу вёскі Навасёлкі, што ў Бярозаўскім раёне, трое чалавек трапілі пад колы аўтамабіля «Мерседэс».

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, за рулём аўтамабіля знаходзіўся 39-гадовы брастаўчанін, а наезд быў учынены на трох жыхароў горада Белаазёрска — 1949, 1953 і 1962 гадоў нараджэння, якія пераходзілі праезную частку. Пешаходы, дарэчы, былі без святлоадбівальных элементаў. У выніку здарэння двое пешаходаў загінулі, а адзін з цялесным пашкоджаннямі змешчаны ў бальніцу.

Ул. інф.

ЖЫХАР СМАРГОНІ ЗНАЙШОЎ У СВАІМ АЎТАМАБІЛІ МЕТРОВАГА ВУЖА

Жыхар Смаргоні знайшоў у багажніку свайго аўтамабіля вялікую змяю, якая адразу ж схавалася за абшыўкай. На дапамогу мужчына выклікаў ратавальнікаў. Аб гэтым расказаў дыспетчар цэнтра аператыўнага ўпраўлення Смаргонскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Міхаіл Вагера.

Паводле яго слоў, супрацоўнікі МНС, упершыню выкліканыя па такой незвычайнай справе, апранулі спецыяльныя рукавіцы і ўзброіліся палкай-рагаткай. Аднак яны ім не спатрэбіліся. Пасля нядоўгіх пошукаў ратавальнікі знайшлі ў машыне метровага вужа, якога тут жа адпусцілі ў мясцовую рачулку Гервятка.

Жыхар Смаргоні мяркуе, што вуж правёў у багажніку яго легкавога аўтамабіля цэлы тыдзень — менавіта столькі часу прайшло з той пары, калі гаспадар аўто ездзіў па грыбы.

БЕЛТА.

ТРАПІЎ ПАД ЦЯГНІК

Ён ехаў з Мінска да брата ў Ваўкавыск, але чамусьці выйшаў на станцыі Пагарэльцы (Нясвіжскі раён).

Яшчэ не ўстаноўлена, як трапіў гэты 45-гадовы мужчына пад цягнік і пад які, але пры загінулым былі дакументы і па іх удалося ўстанавіць, што ён грамадзянін Беларусі, часова пражываў у Расіі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

«БЕЗ МЯНЕ МЯНЕ АЖАНІЛІ»

Такога на прадпрыемствах Гомеля яшчэ не было, а вось жа здарылася. На вагонарамонтным заводзе імя Калініна. Там звольнілі слесара, які... не падаваў заяву на гэта. Тым не менш адпаведны запіс у працоўнай кніжцы быў зроблены. Рабочы справядліва абурыўся (маўляў, без мяне мяне ажанілі) і накіраваўся ў суд.

Пачаўся разбор, і слесара аднавілі на рабоце з выплатай яму больш за тры мільёны рублёў за вымушаныя прагулы. Кіраўнікі прадпрыемства падалі касацыйную скаргу ў вышэйстаячую судовую інстанцыю, але там падтрымалі рашэнне раённага суда. Тады яны вырашылі вярнуць гэтыя грошы ў так званым рэгрэсным парадку. Гэта значыць, звярнуліся ў пракуратуру спагнаць іх з майстра, які падрабіў почырк слесара (гэта ўстанавіла экспертыза) і такім чынам спрабаваў вызваліцца ад непажаданага рабочага.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Беларуская фінансавая сістэма мінімальна залежыць ад праблемных тэндэнцый на сусветных рынках

Фінансавая сістэма Беларусі працуе ўстойліва, і праблемныя тэндэнцыі на сусветных фінансавых рынках аказваюць на яе мінімальнае ўздзеянне. Аб гэтым далажыў 25 верасня кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі.

Паводле слоў прэм'ера, беларускія сродкі цяпер не размяшчаюцца на фондавых рынках, таму галоўнае сёння, каб банкі, якія маюць пазыкі, выконвалі свае крэдытна-імпартныя аперацыі як унутры краіны, так і за яе межамі.

Прэзідэнту было даложана, што ўрад і Нацыянальны банк поўнасцю кантралююць сітуацыю, прымаючы ўсе неабходныя меры, каб засцерагчы ад небяспекі ўнутраны рынак краіны ад знешніх уздзеянняў. «Пакуль нам гэта ўдаецца. І мы не прымалі ніякіх дадатковых мераў, працуючы ў звычайным рэжыме», — адзначыў кіраўнік урада.

Сяргей Сідорскі таксама далажыў Прэзідэнту аб ходзе завяршэння асенніх палявых работ у абласцях краіны. Цяпер практычна ўсе вобласці адстаюць у пад'ёме зяблева і завяршэнні сяўбы азімых. Даручэнні, якія дае ўрад, пакуль не знаходзяць дастатковага адбітку, канстатаваў прэм'ер-міністр. Толькі Мінская вобласць прадставіла ўраду дакладны графік завяршэння асенніх работ.

Кіраўнік дзяржавы даручыў 29 верасня прадставіць зводную справаздачу абласцей па завяршэнні асенніх палявых работ. Таму неадкладна будуць дадзены даручэнні ў вобласці, у канкрэтныя раёны, каб максімальна хутка завяршыць азімую сяўбу, а таксама ўборку лёну і агародніны. Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб сацыяльна-эканамічным развіцці краіны ў цэлым. У прамысловым сектары беларускай эканомікі рост ідзе апераджальнымі тэмпамі. Тэмп росту аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі за восем месяцаў гэтага года склаў 113,1 працэнта, што вышэй за прагноз (108—109 працэнтаў) і заданне, што ўстаноўлена ўрадам (111 працэнтаў). Істотна ўзраслі тэмпы росту аб'ёму вытворчасці ў сельскай гаспадарцы. За восем месяцаў 2008 года вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі павялічылася на 7,4 працэнта.

За студзень—жнівень тэмп росту інвестыцый у асноўны капітал склаў 121,8 працэнта, што перавышае зацверджанае заданне (115—117 працэнтаў).

Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг у прамысловасці за студзень—ліпень склала 18,6 працэнта пры прагнозе 12—13 працэнтаў. Гэта сведчыць аб тым, што сёння ідзе актыўная мадэрнізацыя беларускіх прадпрыемстваў, асвойваюцца новыя віды прадукцыі, інавацыйныя праграмы даюць пэўную аддачу рэальнай эканоміцы.

Усё гэта садзейнічала таму, што за восем месяцаў ВУП узрос на 10,6 працэнта пры прагнозе на 2008 год — 8—9 працэнтаў.

За студзень—ліпень сярэднямесячная заработная плата ў краіне склала Br832,8 тыс., у тым ліку ў ліпені — Br923,3 тыс. Рэальная зарплата ў студзені—ліпені ўзрасла на 8,4 працэнта.

Апераджальнымі тэмпамі ідзе павышэнне ўзроўню прадукцыйнасці працы. Гэты паказчык па выніках сямі месяцаў 2008 года склаў 110,1 працэнта пры прагнозным значэнні 106,9—107,7 працэнта.

Забяспечана выкананне 17 з 19 найважнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2008 год. Не ўдалося забяспечыць выкананне толькі двух параметраў — гэта экспартныя і імпартныя аперацыі.

Прэм'ер-міністр таксама далажыў Прэзідэнту аб парадку дня маючага адбыцца 6 кастрычніка пасяджэння саюзнага ўрада. Старшыня расійскага ўрада Уладзімір Пуцін папрасіў аб сустрэчы з кіраўніком беларускай дзяржавы, і беларускі прэм'ер перадаў просьбу свайго калегі. Аляксандр Лукашэнка даў на яе згоду.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЯЖА ПАМІЖ РАСІЯЙ І ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІЯЙ МОЖА БЫЦЬ ЗНЯТАЯ

Мяжа паміж Расіяй і Паўднёвай Асеціяй можа быць знятая, адпаведныя механізмы ёсць у нядаўна падпісанай дамове аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Масквой і Цхінвалі, паведаміў прэм'ер-міністр РФ Уладзімір Пуцін.

«Што ж датычыцца інтэграцыі, на сёння нам дастаткова будзе, калі мы, аказваючы садзейнічанне ў эканамічным аднаўленні Паўднёвай Асеціі, па сутнасці ліквідуем межы паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Паўднёвая Асеція і дадзім магчымасць людзям там спакойна жыць і гадаваць дзяцей, развіваць сваю рэспубліку, свабодна мець стасункі без усякіх абмежаванняў, без фармальнасцяў на дзяржаўнай мяжы», — сказаў Пуцін на сустрэчы з сакратарамі рэгіянальных аддзяленняў і кіраўнікамі фракцый «Адзінай Расіі» ў рэгіянальных заканадаўчых сходах.

ПОЛЬСКІ СОЙМ ЗРЭЖА ПЕНСІЮ ВОЙЦЭХА ЯРУЗЕЛЬСКАГА

«Грамадзянская платформа», найбуйнейшая партыя ў польскім сойме, унесла на разгляд дэпутатаў законапраект аб скарачэнні пенсій былых камуністычных кіраўнікоў і супрацоўнікаў дзяржаўнай бяспекі. У прыватнасці, пад скарачэнне трапляе пенсія экс-прэзідэнта Войцэха Ярузельскага.

Скарачэнні распаўсюджваюцца на тых, хто служыў у органах дзяржбяспекі ў перыяд з 1944 па 1990 год, а таксама на членаў камуністычнага польскага кіраўніцтва ў перыяд пасля 1981 года. Чакаецца, што сойм зацвердзіць законапраект, паколькі другая вядучая партыя, «Закон і справядлівасць», таксама падтрымлівае скарачэнне пенсій камуністаў.

Па падліках польскіх СМІ, штомесячныя пенсіі былых генералаў органаў бяспекі будуць паменшаныя з 8 тысяч злотых (каля 3,5 тысячы долараў ЗША) да 2,5 тысячы (1,1 тысячы долараў). Некаторыя пенсіі скароцяцца да прадугледжанага польскім законам мінімуму — 636 злотых (280 долараў). Новы законапраект можа зберагчы для казны амаль 600 мільёнаў злотых у год. Частка сродкаў мяркуецца выдаткаваць на дапамогу ахвярам камуністычных рэпрэсій.

У ІРАНЕ З'ЯВІЛІСЯ МУСУЛЬМАНСКІЯ БАРБІ І КЕН

У Іране пачаўся продаж Сары і Дарунка — мусульманскага аналагу Барбі і Кена.

Лялькі-двайняты Сара і Дарунак распрацаваныя іранскім урадавым Інстытутам інтэлектуальнага развіцця дзяцей і моладзі спецыяльна для таго, каб процістаяць шкоднаму ўплыву амерыканскай Барбі на падрастаючых мусульман і спрыяць укараненню традыцыйных ісламскіх каштоўнасцяў.

Да таго, як з'явіцца на прылаўках крам цацак, персанажы Сара і Дарунак з'явіліся на старонках школьных падручнікаў, каб дзеці прывыклі і палюбілі іх. Лялькі каштуюць на трэць танней за Барбі і Кена, якія пастаўляюцца з ЗША — каля сямі долараў — і прадаюцца ў камплекце з відэагісторыямі аб іх жыцці.

Сары і Дарунку па восем гадоў, яны сціпла апранутыя, заўсёды дапамагаюць адно аднаму і звяртаюцца па парады да сваіх любячых бацькоў. Хоць Сара яшчэ можа, па ісламскіх законах, з'яўляцца ў грамадскіх месцах з непакрытай галавой, вытворцы прыклалі да ўсіх чатырох мадыфікацый лялькідзяўчынкі белую галаўную накідку.

Гэта не першы выпадак выцяснення Барбі з рынкаў мусульманскіх краін. У 2003 годзе ў Егіпце з'явілася лялька Фула, апранутая ў традыцыйнае адзенне і хіджаб. Акрамя адзення ў камплекце з лялькай прадаецца і ружовы дываноў для штодзённых малітваў. Фула карыстаецца велізарнай папулярнасцю і прадаецца больш, чым Барбі, таму што адпавядае ісламскім каштоўнасцям.

ДАХОДЫ ЧЫНОЎНІКАЎ-ХАБАРНІКАЎ ПЕРАВЫШАЮЦЬ ТРЭЦЬ НАЦБЮДЖЭТУ РФ

Даходы карумпаваных чыноўнікаў, па экспертных адзнаках, перавышаюць сёння трэцюю частку нацыянальнага бюджэту Расійскай Федэрацыі, паведаміў дарадца кіраўніка МУС РФ Анатоль Кулікаў.

«Фонд «Індэм» ацэньвае суму хабараў, якія прадпрымальнікі расходуюць на подкуп чыноўнікаў, у 33,5 мільярда долараў, а бытавую карупцыю — у тры мільярды долараў», — прывёў Кулікаў даныя гэтай арганізацыі, якая займаецца палітычнымі даследаваннямі.

«Актывізацыя барацьбы з карупцыяй, хочацца верыць, не акцыя, а тэндэнцыя. З узбуджаных у 2008 годзе крымінальных спраў супраць асобаў, абвінавачаных у карупцыі, 757 (амаль чвэрць) — суб'екты з асобым прававым статусам. Гэта следчыя, пракуроры, адвакаты, суддзі, дэпутаты заканадаўчых органаў муніцыпальнага і рэгіянальнага ўзроўняў», — адзначыў Кулікаў.

Дарадца кіраўніка МУС прывёў даныя за 2007 год: падраздзяленні дэпартамента па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ведамства выявілі 74 тысячы злачынстваў у крэдытна-фінансавай сферы. Сума ўрону, нанесенага дзяржаве і ўласнікам, перавысіла 31 мільярд рублёў.

«ВЯСКОВЫЯ КАВАЛЕРЫ»

Брэсцкая вобласць.

Заключны «тэлевізійны» акорд — у Слаўгарадзе

Заканчэнне падпісной кампаніі на 4-ы квартал 2008 года супала з інтэнсіўным раз'ездам супрацоўнікаў газеты «Звязда» па месцы жыхарства шчасліўчыкаў, якія выйгралі ў газеце суперпрызы.

Адзін з іх выпаў на горад Слаўгарад Магілёўскай вобласці, дзе жыве наша даўняя падпісчыца Дар'я Фёдараўна Карпенка. Гэтымі днямі газета «Звязда», захапіўшы па дарозе яшчэ некалькі «падпісных» рэгіёнаў Міншчыны і Магілёўшчыны, даставіла каштоўны прыз пенсіянерцы. Ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыла тэлевізар «Віцязь» бабулі галоўны спецыяліст аддзела ідэалогіі Слаўгарадскага райвыканкама Таццяна Бабічава.

На сустрэчы з актывам раёна было шмат сказана пра старэйшае беларускамоўнае выданне, якому сёлета споўніўся 91 год, праведзена віктарына на веданне гісторыі газеты. Кемлівасцю і добрымі ведамі пра газету вызначыўся начальнік аддзела Дэпартамента аховы МУС Беларусі Анатоль Салянік, за што атрымаў каштоўны звяздоўскі прыз — настольны гадзіннік.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

Боровлянский сельский исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельных участков сроком на 99 лет для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Минском р-не, д. Слободщина (Московское направление):

№ лота	Площадь земельного участка, кадастровый номер	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы, связанные с подготовкой документации (бел. руб.)
1	0,1363 га 623680608101000068	электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение	14 646 798	1 400 000	966 710
2	0,1362 га 623680608101000070		14 636 052		966 710
3	0,1339 га 623680608101000069		14 388 894		966 710

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата предмета аукциона должна быть произведена в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка. Договор аренды земельного участка заключается с победителем аукциона в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона, возмещения расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **29.10.2008 года** в 12.00 по адресу: Минский р-н, п. Лесной, Боровлянский сельисполком. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **28.10.2008 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

Слободской сельский исполнительный комитет Столбцовского района (продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы, связанные с подготовкой документации (бел. руб.)
1	д. Кучкуны, ул. Лесная, 2, 625485201601000099	0,2276 га	В непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения; рядом остановка электропоезда.	162 730	16 000	1 236 360
2	д. Кучкуны, ул. Лесная, 4, 625485201601000100	0,2484 га		177 610	17 000	1 236 360
3	д. Отцеда, ул. Полевая, 625485202101000079	0,1507 га	В непосредственной близости сети электроснабжения, проводится работа по газификации; рядом остановка электропоезда.	76 010	7 500	1 236 360

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **28.10.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.10.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул.Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.09.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 104,12
1 латвійскі лат	4 382,85
1 літоўскі літ	898,99
1 чэшская крона	126,75
1 польскі злоты	932,21
1 расійскі рубель	84,79
1 украінская грыўня	415,18

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	24,8982
10 UAH	49,0605
1000 BYR	11,7889
EUR	36,7099

Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.09.2008 г.)

USD ..... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!
Ідзе падпіска на IV квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы
63850 (індывідуальны)	9200	27600
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8700	26100
63858 (ведамасны)	14700	44100
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	13400	40200

С. Багапш і Э. Какойты звярнуліся да Прэзідэнта Беларусі з просьбай аб прызнанні Абхазіі і Паўднёвай Асеціі

На імя Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі паступілі пісьмы з асабістымі зваротамі прэзідэнтаў Абхазіі і Паўднёвай Асеціі Сяргея Багапша і Эдуарда Какойты з просьбай аб прызнанні Беларуссю незалежнасці іх рэспублік. Кіраўнікам Абхазіі і Паўднёвай Асеціі накіраваны адказы з выкладаннем пазіцыі беларускага боку па гэтым пытанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выбары-2008

Крок у патрэбным накірунку

Кіраўнік дэлегацыі ПА АБСЕ кажа аб знакавасці дня выбараў для адносінаў Беларусі з Еўрасаюзам

Старшыня Савета Рэспублікі Генадзь Навіцкі сустрэўся ўчора з кіраўніком дэлегацыі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, каардынатарам кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЕ на парламенцкіх выбарах у Беларусі, віцэ-старшынёй ПА АБСЕ Ан-Мары Лізэн.

— У мяне ёсць не толькі надзеі, але і ўпэўненасць, што вы гэту місію праведзяце высокапрафесійна, справядліва і аб'ектыўна, — падкрэсліў у сваім звароце да госці спадар Навіцкі.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента згадаў, што меры, прынятыя кіраўніцтвам краіны, накіраваныя на тое, каб выбары прайшлі адкрыта і дэмакратычна — «каб ні ў кога не ўзнікла сумненняў не толькі ў нейкіх там парушэннях, але і ў дробных шурпатасцях». З улікам зробленага краінай, ён выказаў поўную ўпэўненасць у тым, што выбары пройдуць сапраўды так і «самае галоўнае, пры такім падыходзе будзе поўнасцю адлюстравана пазіцыя і воля беларускага народа».

Ан-Мары Лізэн у сваю чаргу заявіла, што жаданне місіі — убачыць рэальнасць ходу правядзення выбараў, «хоць мы ўжо ведаем шмат аб тых намаганнях, якія прыклала кіраўніцтва краіны, каб выбары гэтыя прайшлі дастойна». Яна падкрэсліла жаданне ўзяць удзел не толькі ў назіранні за правядзеннем выбараў, але і ў падліку галасоў. Спадарыня Лізэн адзначыла вялікі інтарэс міжнароднага супольніцтва да правядзення выбараў у Беларусі і дадала: «Ніхто не сумняваецца, што Беларусь з'яўляецца еўрапейскай краінай, аднак на гэты момант нашы ўзаемаадносіны, на мой погляд, не такія актыўныя, якімі маглі б быць». Яна зрабіла акцэнт на тым, што інфармацыя, якую апублікуюць па выніках работы назіральнай місіі АБСЕ, будзе мець вялікае значэнне для Еўрасаюза.

— Вядома ж, дзень выбараў не вырашыць усіх праблем, аднак ён можа быць важным крокам у гэтым накірунку, — рэзюмавала каардынатар кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЕ.

Ала МАЧАЛАВА.

Парламенцкія выбары стануць тэстам для еўрапейскіх партнёраў у плане аб'ектыўнасці і неангажыраванасці

Аб гэтым заявіў на брыфінгу прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў, адказваючы на пытанні журналістаў.

Аб важнасці развіцця двухбаковага супрацоўніцтва сведчыць і той факт, што за апошнія 8 гадоў тавараабарот паміж Беларуссю і ЕС вырас у 15 разоў. Прэс-сакратар МЗС падкрэсліў, што Беларусь паслядоўна праводзіла і праводзіць лінію па развіцці супрацоўніцтва з ЕС.

«Еўрапейскія партнёры гавораць нам, што гэта выбарчая кампанія павінна стаць пэўным тэстам. Я думаю, справядліва будзе сказаць, што і для нашых еўрапейскіх партнёраў выбарная кампанія таксама будзе тэстам на дальнабачнасць, палітычную мудрасць і сталасць. Відавочна, што дзеянні Еўрапейскага саюза па выбарнаму сюжэту ў адносінах да нашай краіны будуць мець значнае ўздзеянне на суму геапалітычных фактараў у нашым рэгіёне», — падкрэсліў Андрэй Папоў.

Акрамя таго, маючыя адбыцца выбары стануць тэстам для АБСЕ. «Нам вельмі важна паглядзець на тое, у якой меры гэта арганізацыя будзе здольная паказаць аб'ектыўнасць, неангажыраванасць і здольнасць пазбягаць любога знешняга націску. Што датычыцца заяў, якія прагучалі літаральна нядаўна з боку некаторых прадстаўнікоў кангрэса ЗША, то яны, сама меней, па сваёй сутнасці ўяўляюць сабой яўнае ўмяшанне ў выбарчы працэс і прадвызначэнне магчымых ацэнак выбарчага працэсу з боку заходніх наглядальнікаў», — падкрэсліў афіцыйны прадстаўнік беларускага МЗС. У сувязі з гэтым Андрэй Папоў заўважыў, што «нам бы вельмі хацелася, каб наглядальнікі АБСЕ прыклалі ўсе намаганні для таго, каб пазбегнуць і не трапляць пад такі знешні націск».

БЕЛТА.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

КОШТ БІЛЕТАЎ НА КАНЦЭРТЫ «ЗОРАК» — ВЫНІК РЫНКАВЫХ АДНОСІНАЎ

На «Ліст у нумар» Мікалая Васіленкі з Мінска, які быў апублікаваны ў газеце 24 верасня пад назвай «На канцэрт не трапіў…», аператыўна адгукнуўся і прапанаваў прадоўжыць тэму пенсіянер з вёскі Раванічы Чэрвеньскага раёна Іван Уласавец.

— Жыву я не так ужо і далёка ад сталіцы. Люблю і тэатр, і цырк. Магу, напрыклад, паехаць адзін у Мінск у нядзелю, патрапіць на тэатральную пастаноўку на 11.30, а на 15 гадзін — на цыркавое прадстаўленне, і ўвечары вярнуцца дадому. З задавальненнем наведаў бы і які канцэрт, ды толькі… Згодны з аўтарам ліста ў рэдакцыю: чаму ж такія дарагія білеты на выступленні заезных «зорак»? Напрыклад, у Мінск неяк двойчы прыязджала Надзея Кадышава, я з ахвотай паслухаў бы песні ў яе выкананні. Але ж білеты былі па 150 тысяч рублёў!? Вы спытайце ў чыноўнікаў: як, з чаго фарміруюцца такія цэны на білеты «зорак? — прасіў нас Уладзімір Паўлавіч.

Суразмоўца цалкам быў згодны і з тым, што нашы ўласныя артысты (нічым не горшыя за заезных) мала рэкламуюцца. Дакладней, іх мала рэкламуюць.

— Афішу пастановак, канцэртаў, кінапрэм'ер практычна нельга знайсці, хоць я пераглядаю шэраг выданняў. Раз-пораз нешта друкуецца, але, на мой погляд, гэтага недастаткова, — гаварыў чытач.

Як паведамілі нам у Міністэрстве культуры, найбольш поўны анонс спектакляў, кінапаказаў, выстаў, канцэртаў друкуе часопіс «РИО». У сталіцы да таго ж працуе спецыяльная тэлефонная даведка, па горадзе расклейваюцца афішы. Не мінчаніну, безумоўна, зручней было б атрымліваць патрэбную інфармацыю праз СМІ. Аднак многія газеты адмаўляюцца яе друкаваць, прынамсі, бясплатна…

— Таму можам параіць вашаму чытачу або выпісаць часопіс, або, калі ён будзе наступным разам у сталіцы, перапісаць афішу тэатра на месяц, ці, як варыянт, запісаць нумар яго тэлефона і даведвацца аб пастаноўках па ім, — адказалі рэдакцыі ў міністэрстве.

Што да цэнаў на білеты… Сітуацыю па нашай просьбе коратка пракаментаваў начальнік аддзела па справах мастацтваў упраўлення культуры Мінгарвыканкама Уладзімір Анціповіч. Менавіта ў яго абавязкі ўваходзіць выдача дзяржаўных пасведчанняў на канцэртную дзейнасць, у тым ліку і памянёных вышэй «зорак».

— Калі гаварыць пра нашы дзяржаўныя арганізацыі, напрыклад, маладзёжны тэатр эстрады, тэатр імя Янкі Купалы, дык цэны на білеты ў іх зафіксаваныя на пэўным узроўні. Могуць рэалізоўвацца і сацыяльныя білеты для інвалідаў, праводзіцца дабрачынныя акцыі, — сказаў Уладзімір Валер'евіч. — Што да «зорак», там уступаюць у дзеянне рынкавыя адносіны. Кожны артыст, спявак мае на сёння пэўную таксу, за якую будзе згодны выступаць. Гэта інфармацыя не сакрэтная, яна даступная ў інтэрнэце. Скажам, Пугачова за выступленне просіць 35 тысяч доларaў — хоць бы і за адну песню, гэта ўжо як дамовішся. Арганізатару канцэрта дадаткова трэба задаволіць яшчэ і палажэнні райдара артыста — па пражыванні («люкс» на сёмым паверсе, умоўна кажучы, ці абавязкова зацемнены пакой), харчаванні, транспартным абслугоўванні. Гэта таксама каштуе пэўных грошай. Трэба аплаціць арэнду залы, абавязкова ўлічыць яго ўмяшчальнасць. Сам арганізатар таксама не будзе працаваць бясплатна, значыць, закладваецца пэўны прыбытак, прычым яму трэба ўлічваць магчымыя фінансавыя рызыкі. Галоўная праблема для яго — не «прагарэць». Вось з усяго гэтага і складваецца канчатковы кошт білетаў. Іншымі словамі, усё вырашаецца на камерцыйнай аснове: наўрад ці «зорка» будзе выступаць за ганарар, які, як палічыць яна, не адпавядае яе зоркаваму статусу…

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пытальнік

Няўстойка — за кожны дзень пратэрміноўкі заказу

Патлумачце, калі ласка, ці можа спажывец спагнаць няўстойку з магазіна, які затрымлівае выкананне заказу больш чым на месяц. Дырэктар магазіна кажа, што ад іх нічога не залежыць — гэта вытворчасць не спраўляецца з заказамі. Але ж мы заключылі дагавор з магазінам, а не з прадпрыемствам, і ў дакуменце запісана, што пры несвоечасовай адгрузцы тавару прадавец выплачвае пеню ў памеры 0,1 працэнта ад сумы тавару за кожны дзень пратэрміноўкі. Нягледзячы на вельмі нятанны заказ, сума няўстойкі атрымліваецца нейкая несур'ёзная. Выходзіць, што магазіну можна без праблем парушаць умовы дагавора — яго фінансавыя інтарэсы пры гэтым моцна не пацерпяць, тым больш, што магазін з'яўляецца структурным падраздзяленнем фабрыкі-вытворцы. Калі б яны ўстанавілі больш працяглыя тэрміны выканання заказаў, то кліент мог пайсці да канкурэнта. Складваецца ўражанне, што галоўная задача — набраць пабольшэй заказаў, а затым спаслацца на форс-мажорныя абставіны.

М.Я., г. *Мінск.*

Як патлумачыла нам старшыня Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Ганна Суша, згодна з артыкулам 29 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў», калі выканаўца парушыў тэрміны выкання работы (аказання паслугі), асобных этапаў работы (аказання паслугі), а таксама іншыя тэрміны, прадугледжаныя дагаворам, ці ў час выкання работы (аказання паслугі) стала відавочна, што яна не будзе выканана ў тэрмін, спажывец мае права на свой выбар патрабаваць: суразмернага змяншэння цаны за выкананне работы (аказанне паслугі), скасавання дагавора аб выкананні работы або патрабаваць поўную кампенсацыю страт, нанесеных яму ў сувязі з парушэннем тэрмінаў выканання работы (аказання паслугі).

У пункце 6 артыкула 29 запісана, што ў выпадку парушэння ўстаноўленых тэрмінаў выканання работы (аказання паслугі) выканаўца выплачвае спажыўцу за кожны дзень пратэрміноўкі няўстойку ў памеры аднаго працэнта цаны выканання работы (аказання паслугі), а калі цана выканання работы дагаворам аб выкананні работ не вызначана — у памеры аднаго працэнта ад агульнай цаны заказу. Да таго ж дагаворам аб выкананні работы (аказанні паслугі) паміж спажыўцом і выканаўцам можа быць устаноўлены і больш высокі памер няўстойкі.

У сітуацыі, якую апісаў наш чытач, усё наадварот: выканаўца ўстанавіў няўстойку ў памеры 0,1 працэнта ад сумы тавару. «Згодна з артыкулам 18 Закона «Аб абароне правоў спажыўцоў», умовы дагавора, якія ўшчамляюць правы спажыўца ў параўнанні з правамі, устаноўленымі гэтым Законам і іншым заканадаўствам у галіне абароны правоў спажыўцоў, лічацца нязначнымі, — патлумачыла Ганна Суша. — Гэта значыць, што ваш чытач можа спагнаць з выканаўцы заказу няўстойку ў памеры 1 працэнта ад кошту заказу за кожны дзень пратэрміноўкі, а выканаўцай у дадзеным выпадку з'яўляецца магазін, а не фабрыка-вытворца…».

Надзея НІКАЛАЕВА.

У ПЛЕШЧАНІЦАХ «ГАЗАНУЛІ»

Для сімвалічнага пуску прыгоднага газу і адкрыцця газаправода на мітынг у гарадскім пасёлку Плешчаніцы сабраліся мясцовыя жыхары і кіраўніцтва Мінскай вобласці ў мінулую сераду. Запаліць факел даверылі кіраўніку Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леаніду Крупцу, які з задачай паспяхова справіўся, праўда, не адзін, а разам з мясцовым хлопчыкам.

Да гэтага часу ў Плешчаніцах газазабеспячэнне ажыццяўлялася толькі пры дапамозе звадкаванага газу, які прывозілі ў балонах і аўтацыстэрнах з Княгінінскай газанапаўняльнай станцыі за 70 кіламетраў. Сёння ж у 842 кватэрах жылога фонду, газ у якія паступаў цэнтралізавана ад сетак звадкаванага газу, ужо ідзе прыродны газ ад толькі што пабудаванага газаправоду. Астатнія жыхары Плешчаніцаў пакуль на старынцы будуць карыстацца газавымі балонамі, але нядоўга. Бо на заказ прадпрыемства «Мінскаблгаз» ПРУП «Белгіпрагаз» распрацавала схемы газазабеспячэння Плешчаніцаў прыродным газам, прычым не толькі жылога сектара, але і іншых аб'ектаў — аўтапарка № 12, бальніцы, Дома культуры, РВЭС, хлебазавода, РУП «Кобальт», лазні, школы, пажарнай часці, КУП «Даррэмбуд», вайсковай часці, птушкафабрыкі і г.д.

— Перад будаўніцтвам гэтага газаправода, — сказаў у выступленні перад мясцовымі жыхарамі генеральны дырэктар ДВА «Белпаліўгаз» Леанід Рудзінскі, — мы думалі, як жа будзе лепей пабудаваць: карацейшы, але пусты ўздоўж дарогі ад Лагойска, ці пабудаваць па лагойскай зямлі, каб максімуму ахапіць населеныя пункты? І вырашылі, што лепей больш доўгі, але каб ён ахапіў як мага болей людзей. Сёлета ў лістападзе спаўняецца 50 гадоў, як пачалася газіфікацыя ў краіне. За гэты кароткі гістарычны перыяд газіфікавана 117 са 118 раёнаў у рэспубліцы, у гэтым годзе будзе газіфікаваны апошні раённы цэнтр — Беразіно Мінскай вобласці.

Старшыня Мінскага аблвыканкама Леанід КРУПЕЦ разам з мясцовым хлопчыкам запальваюць сімвалічны факел.

Раскрыў Леанід Іванавіч і невялікі сакрэт, які павінен будзе палегчыць з'яўленне прыроднага газу ў кожным індывідуальным доме:

— Цяпер Прэзідэнтам краіны разглядаецца праект указа аб павелічэнні долі аказання дапамогі насельніцтву ў газіфікацыі. Я думаю, што гэты дакумент будзе падпісаны. Акрамя таго, можна браць крэдыты ў банку, таму я лічу, што Плешчаніцы будуць газіфікаваныя ў бліжэйшы час на 100 працэнтаў, як і шматлікія іншыя населеныя пункты ў рэспубліцы.

Варта адзначыць, што будаўніцтва амаль 38 кіламетраў газаправода да Плешчаніцаў абышлося бюджэту ў досыць вялікую суму — 7 мільярдаў рублёў (гэта толькі за будаўніцтва-мантаж, без уліку праектавання, накладных выдаткаў). Калі браць Мінскую вобласць, то з 18 пасёлкаў гарадскога тыпу засталіся негазіфікаванымі тры — Крывічы і Свір Мядзельскага раёна, Урэчча — Любанскага. На думку генеральнага дырэктара УП «Мінскаблгаз» Сяргея Жардзецкага, больш за ўсё шанцаў атрымаць прыродны газ ва Урэччы, бо на будаўніцтва трубаправодаў да г.п. Свір і Крывічы трэба вельмі шмат укладанняў, дый працягласць газаправоду там будзе яшчэ большая, чым да Плешчаніцаў. Па словах Сяргея Генадзьевіча, пры поўнай загрузцы газаправод да Плешчаніцаў акупіцца гадоў праз 15, аднак гендырэктар УП «Мінскаблгаз» парасіў не забываць, што гэта сацыяльная праграма, і жыхары Плешчаніц павінны карыстацца выгодамі прыроднага газу як і астатнія жыхары рэспублікі.

Леанід Крупец у гутарцы з журналістамі адзначыў, што адкрыццё гэтага газаправода — сапраўднае свята для людзей, і выказаў меркаванне, што газіфікацыя пасёлка дазволіць наноў яго адрадзіць.

— Я не сумняваюся, што тут з'явіцца новая вытворчасць, людзі застануцца жыць больш камфортна, будуць заставацца тут жыць і працаваць, што палепшыцца дэмаграфічная сітуацыя, — сказаў Леанід Фёдаравіч. — Хачу сёння паабяцаць вам усім, што мы і далей будзем весці працу па добраўпарадкаванні. Вашы дзяўчаты ўжо мне сказалі, што на абцасах хадзіць цяжка, бо асфальт дрэнны. Будзе асфальт, па гэтай вуліцы ў першую чаргу, і будзе да новага года!

Павел БЕРАСНЕЎ.

ПЫТАННЕ ЛЁСУ

— Мы пачалі з чыстага ліста, — расказвае дэкан факультэта, прафесар кафедры дызайну Тамара ШУСЦЯРНЯК. — З гэтым былі звязаны пэўныя цяжкасці, але мы рызыкнулі і ў нас атрымалася. Конкурс сярод слухачоў, жаданне выкладчыкаў працаваць, і галоўнае — поспехі выпускнікоў у працаўладкаванні сведчаць, што нам удаецца задаволіць чаканні людзей.

Наша жыццё імкліва рухаецца наперад. Сучаснаму чалавеку, каб паспець за ім, неабходна ўвесь час удасканальвацца і развівацца. Сёння тыя, хто атрымаў спецыяльную адукацыю некалькі гадоў таму, ужо маюць патрэбу ў новых ведах і навыках. Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў адказала на патрабаванне часу. У 2005 годзе па ініцыятыве рэктара Акадэміі, прафесара, доктара мастацтвазнаўства Рычарда СМОЛЬСКАГА быў адкрыты факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў работнікаў культуры і дзеячаў мастацтва. Сёння ўжо можна сказаць, што стваральнікі новага факультэта патрапілі ў яблычак.

Акадэмія ажыццяўляе набор на перападрыхтоўку па шэрагу накірункаў у сферы дызайну: дызайн-менеджмент, дызайн графічны, мастацкае афармленне інтэр'ераў, дызайн выставак і гандлёвых экспазіцый, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. А таксама ў сферы кінатэлемастацтва: гукарэжысура і рэжысура. Сёлета ўжо набраны слухачы на рэжысуру і графічны дызайн, да канца года яшчэ адкрыты набор на дызайнменеджмент і гукарэжысуру. Перападрыхтоўка адбываецца на базе вышэйшай адукацыі з прысваенне кваліфікацыі і выдачай дыплома дзяржаўнага ўзору.

Акрамя таго на факультэце ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі на базе вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі тэрмінам два тыдні з выдачай пасведчання дзяржаўнага ўзору, а таксама стажыроўка ад 3 да 6 месяцаў.

Усе гэтыя формы адукацыі з'яўляюцца платнымі. За стажыроўку і павышэнне кваліфікацыі неабходна заплаціць 150 тысяч беларускіх рублёў у месяц, а за перападрыхтоўку — 3 млн за ўвесь перыяд навучання (вячэрняя форма — 18 месяцаў, завочная — 2 гады).

Для таго каб паступіць на перападрыхтоўку, трэба вытрымаць конкурс па выніках іспытаў і мець гутарку з прыёмнай камісіяй. Гутарка мае на ўвазе наяўнасць ведаў па гісторыі і перспектывах развіцця абранай дзейнасці. На ўсе спецыяльнасці выяўленчай сферы трэба здаць малюнак, на рэжысуру — творчую работу (мінулы раз гэта было распрацоўванне сцэнарыя на зададзеную тэму). Падрыхтавацца да іспытаў (напрыклад аднавіць свае навыкі па малюнку) дае магчымасць стажыроўка на факультэце. Слухачы вячэрняй формы іспыты здаюць у лістападзе і ў тым жа месяцы ў іх пачынаецца навучанне, у завочнікаў — у студзені іспыты, у лютым — пачатак заняткаў.

На факультэт прыходзяць вучыцца самыя розныя людзі ад 25 да 50 гадоў, а таксама студэнты старэйшых курсаў ВНУ, у тым ліку і Акадэміі мастацтваў.

— Вучыцца ў нас няпроста, — прызнаецца Тамара Яфрэмаўна.

Заняткі ў новым камп'ютарным класе.

— Не толькі таму, што гэта — вечар, пасля асноўнай працы, і ў кожнага ўжо ёсць сем'і. Справа ў тым, што тут асаблівыя заняткі, якія нельга прапускаць, бо іх мэта — развіць творчасць і майстэрства, а гэта патрабуе навыкаў. Тут немагчыма, седзячы дома, нешта прачытаць, знайсці ў інтэрнэце, прыйсці потым і здаць. Тым не менш факультэт вельмі запатрабаваны, ён дае добрую магчымасць знайсці сваё месца на рынку працы пасля нейкай паўзы ў дзейнасці альбо пры яе змене.

Акадэміі ўдалося прыцягнуць для выкладання на факультэце сапраўды апантаных людзей, Майстроў сваёй справы з вялікай літары. Ды і слухачы аказаліся настолькі ўдзячнымі і матываванымі, што выкладчыкі прызнаюцца: дзяліцца з імі сваімі ведамі і вопытам — вялікае задавальненне.

— Для нашых слухачоў навучанне тут — гэта пытанне жыцця, пытанне лёсу, таму яны вучацца вельмі добра, — расказвае дэкан. — І калі яны адчуваюць, што выкладчык можа даць яшчэ нешта дадаткова, то абавязкова гэта запатрабуюць.

Асаблівы прадмет гонару Тамары Яфрэмаўны — маладыя выкладчыкі камп'ютарнага дызайну, прафесіяналы ў сваёй справе, былыя выпускнікі Акадэміі Сяргей ТУРАЎ, Сяргей ЛУКАШЧЫК, Андрэй КІРШЧЫН і Барыс БАРАЗНА.

Безумоўна, факультэт не мог бы існаваць без падтрымкі і дапамогі кіраўніцтва Акадэміі і яе выдатнага калектыву, усіх, каму важна, каб роля Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў заставалася вядучай у нацыянальнай і еўрапейскай адукацыйнай прасторы.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

УНП 100289132



У творчай майстэрні.

Лекцыю па псіхалогіі ўспрымання студэнтам чытае прарэктар па вучэбнай рабоце, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Лідзія БЯРОЗКІНА.

Это ваш шанс!!!

БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННАЯ АКАДЕМИЯ ИСКУССТВ

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР:

• **двухгодичная переподготовка по следующим специальностям:**
1. Режиссура видеофильма
2. Звукорежиссура
3. Дизайн графический
4. Дизайн-менеджмент (по направлениям).

Форма обучения: очная (вечерняя) и заочная. По окончании обучения выдается диплом государственного образца;

• **курсы повышения квалификации (стажировка) по следующим направлениям:**
1. Дизайн интерьеров мебели
2. Компьютерная и рекламная графика
3. Дизайн тканей и одежды
4. Дизайн выставок и торговых экспозиций
5. Декоративно-прикладное искусство (арт-дизайн)
6. Дизайн транспорта и бытовой техники
7. Телереклама
8. Звукорежиссура
9. Режиссура театра и кино
10. Актерское мастерство.

По окончании обучения выдается свидетельство государственного образца. Срок повышения квалификации (стажировки) от 5 месяцев.

Контактные телефоны: 331 67 99, 8 029 618 98 38.

Абзац

■ Помнік Папу Рымскаму Іаану Паўлу II установлены ў Віцебску. Адкрыццё помніка было прымеркаванае да 30-годдзя з моманту выбрання Іаана Паўла II на прэстол у Рыме. Гэта не першы ў Беларусі помнік пантыфікам. У 2005 г. каля касцёла Святой Ганны ў вёсцы Мосар Глыбоцкага раёна быў установлены першы на тэрыторыі Беларусі помнік Папу Рымскаму Іаану Паўлу II, праз два гады такі ж помнік з'явіўся ў Валожыне, а ў вёсцы Лучай Пастаўскага раёна сёлета ў чэрвені адкрыты помнік дзеючаму кіраўніку каталіцкай царквы — Папу Рымскаму Бенядзікту XVI.

■ **Учора з канвеера «Гомсельмаша» сышоў 10-тысячны збожжаўборачны камбайн «КЗС-812». Юбілейны камбайн у рамках экспартнага кантракта будзе пастаўлены ва Украіну.**

■ Рэдкія манеты часоў Вялікага Княства Літоўскага выявілі беларускія археолагі ў Гродзенскім раёне на месцы будаўніцтва Гродзенскай ГЭС. Зараз манеты даследуюць у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

■ **Былы начальнік аддзела архітэктуры Маладзечанскага райвыканкама Аляксандр Згрундо прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі за замах на атрыманне хабару ў памеры Br53 млн ад мясцовага прадпрымальніка за спрыяльнае вырашэнне пытання аб незаконным выдзяленні зямельнага ўчастка.**

■ Суд Стаўбцоўскага раёна прыгаварыў жыхара Брэсцкай вобласці да 20 гадоў пазбаўлення волі за забойства пажылой жанчыны. Пры затрыманні падазроны 45-гадовы мужчына поўнасцю прызнаў сваю віну, патлумачыўшы, што жанчыну ён забіў за тое, што яна не цалкам расплацілася з ім за зробленую працу — зрэзаныя каля яе хаты таполі. Дачакаўшыся, калі жанчына засне, ён перарэзаў тэлефонны кабель, выставіў аконную раму і задушыў пенсіянерку шпагатам. Для імітацыі крадзяжу раскідаў рэчы і забраў Br230 тыс.

■ **Сёлетняй зімой вуліцы ў Маскве ўпершыню будуць прыбіраць ад пылу. З гэтай мэтай мэрыяй закуплена 22 пыласосы. Таксама вырашана зменшыць колькасць прымяняемых рэагентаў. Тратуары і дваровыя тэрыторыі замест гэтага будуць апрацоўвацца шчэбенем.**

■ Труна адмірала Нэльсана прададзеная за 8160 фунтаў стэрлінгаў (каля 16 тыс. доларaў ЗША). Скрыню з дошак віннай бочкі, у якой у 1806 годзе ў Лондан было дастаўлена цела адмірала пасля гібелі падчас Трафальгарскай бітвы, выставілі на аўкцыён. У сваім завяшчанні Нэльсан папрасіў не кідаць цела за борт, як прадпісваў марскі закон, а даставіць у Лондан. З гэтай мэтай цела адмірала было змешчанае ў вінную бочку, якую залілі каньяком. З яе і зроблена адна са скрыняў, якую прадалі за рэкордную суму.

Поўны абзац

■ **65-гадовы жыхар Румыніі Георг Хус звярнуўся да ўладаў па новы пашпарт, каб наведаць у Італіі свайго сына. Аднак яму адмовілі ў атрыманні дакумента, матывуючы тым, што ён даўно памёр. «Яны сказалі мне, што я памёр у 1994 годзе ад нейкай хваробы лёгкіх. Ёсць і пасведчанне аб тым, што мне зрабілі ўскрыцце і пахавалі на могілках непадалёк ад горада», — расказаў румын. Афіцыйнае расследаванне ўстанавіла, што прычынай казусу стаў паліцэйскі даклад, у якім упамінаецца цёзка Хуса, што памёр у бальніцы. Цяпер чалавеку, што аказаўся жывым, давядзецца чакаць, пакуль суд анулюе пасведчанне аб смерці, потым атрымліваць новыя дакументы.**

■ Брытанская жанчына-вадзіцель патрабуе ад паліцэйскіх кампенсацыі маральнай шкоды за тое, што яе збылталі з мужчынам. 59-гадовая брытанка з кароткімі валасамі была зняпая на дарожную камеру падчас перавышэння хуткасці на аўтамабілі свайго знаёмага. Яна спрабавала аплаціць штраф, аднак паліцэйскія заявілі жанчыне, што за рулём знаходзіцца мужчына. Абураная парушальніца патрабуе даволі істотную суму ў якасці кампенсацыі за абразу.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ПАРОГ

«Праз парог рукі не падаюць» — такое правіла жыве сярод нас і па сёння. Як часта ў сваіх выказваннях мы ўжываем выразы: «на парозе сталасці» ці «на парозе смерці». У сваім класічным выглядзе хата мае тры ўзроўні: верхні (дах (дух)) — займаў пантэон бостваў, духаў; сярэдні ўзровень належаў чалавеку; ніжні — продкам, таму што быў месцам іх спрадвечнага знаходжання. У старажытныя часы менавіта пад парогам знаходзіўся пограб (месца для труны) — месца пахавання спаленых астанкаў памерлых свякоў. Такім чынам, парог у вертыкальнай структуры міфапаэтычнай мадэлі сусвету стаў сімвалізаваць зону продкаў. Парог аддзяляў унутраную прастору хаты ад знешняй. У казачным свеце парогам — сімвалічнай мяжой — былі так званыя «стражы»: драконы, змеі, ільвы, сабакі. Каб увайсці ў нейкае царства, трэба было спачатку адолець (паразмаўляць, дамовіцца, выканаць загады) «стражаў». А яны павінны былі рэгламентаваць паводзіны знаходжання ў гэтым царстве.

Парог заўсёды займаў даволі значнае месца ў сістэме сямейна-родавых абрадаў і знахарстве:

● Цяжарнай жанчыне катэгарычна забаранялася сядзець на парозе, інакш роды будуць занадта цяжкімі.

● Калі нараджаўся хлопчык, пад парог закопвалі дзіцячае месца: каб ён пільнаваўся роднай хаты (жаніўся, нявестку прывёў). Калі нараджалася дзяўчынка, дзіцячае месца закопвалі за парогам: каб яна ў свой час «сышла» з хаты, г.зн. выйшла замуж. Для таго ж ваду, у якой купалі дзяўчынку, вылівалі за парог.

● Пасля хрышчэння дзіцяці на парозе адбываўся абрад яго «асвячэння», які сімвалізаваў уваходжанне дзіцяці ў свет хаты і сям'і, а гэта значыць, і ў свет продкаў: хросныя бацькі клалі дзіця на некалькі імгненняў на парог, а бацькі павінны былі падняць яго і ўнесці ў хату.

● Калі сваты прыходзілі ў хату да дзяўчыны, сват грукаў абцасам правай нагі аб парог і звяртаўся да гаспадароў хаты з такімі словамі: «Як яны (продкі) маўчаць, так і вы не пярэчце!»

● Пасля вянчання бацькі сустракалі маладых хлебам-соллю перад парогам хаты, а тым часам самая старэйшая жанчына ў сям'і, напрыклад, бабуля, сцяліла праз парог ручнік, пад які клала адамкнуты замок. Як толькі жаніх уносіў нявесту ў хату, бабуля замыкала замок, а ключ кідала ў калодзеж. Лічылася, што такім чынам яна назаўжды «замыкала» маладую пару.

● Абярэгам для нявесты было і тое, што жаніх пераносіў яе праз парог, каб яна ў гэты святочны дзень не сутыкалася з зонай смерці, і яе дзіця — працяг роду — нарадзілася здаровым. Калі жаніх пераносіў нявесту праз парог хаты, ён такім чынам імкнуўся «падмануць» ахоўнікаў хаты, каб яны прынялі яе так, як прымалі ўсіх жыхароў гэтай хаты.

● Парог быў важным «удзельнікам» вялікай колькасці варожбаў.

● На парозе «адгаворвалі» такое цяжкое захворванне, як эпілепсія («падучая»).

● Людзі, якія хацелі нашкодзіць гаспадарам хаты, клалі пад парог соль, зямлю з могілак, іголкі ці іншыя рэчы. Калі вы трапілі ў такое становішча, ніколі не прыбірайце гэтыя рэчы голымі рукамі. Самы лепшы сродак — папрасіць прыбраць гэтыя рэчы якую-небудзь пабочную асобу. Справа ў тым, што самі па сабе яны не могуць прынесці шкоды, калі на іх не прачытана замова. А той, хто чытае замову, павінен ведаць ваша імя пасля хрышчэння. Акуратна збярыце соль ці зямлю, загарніце і спаліце на скрыжаванні шляхоў. Калі гэта рабілі хатнім венікам, прыносіць яго дадому ўжо нельга.

● У паўсядзённым жыцці людзям забаранялася сядзець ці стаяць на парозе. Адказ просты: «Нельга турбаваць продкаў без дай-прычыны». Асабліва гэта забарона датычылася нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат.

● Здавён лічылца, што размовы, якія вядуцца праз парог, ці рэчы, перададзеныя праз парог, прывядуць да сваркі.

● Калі чалавек, сыходзячы з хаты, раптам зачапіўся за парог правай нагой — гэта прадказвала поспех, левай — няўдачу.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ОАО «Минский приборостроительный завод»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже комплекса зданий общей площадью 7045,3 кв. м, расположенного в г. Минске по пр. Независимости, 58.

ПРОДАЖА ПРОИЗВОДИТСЯ ДВУМЯ ЛОТАМИ:

Лот 1 — здание корпуса № 40 площадью 4213,1 кв. м. Начальная цена продажи — 15 186 695 000 (пятнадцать миллиардов сто восемьдесят шесть миллионов шестьсот девяноста пять тысяч) рублей РБ с НДС.

Лот 2 — здания корпусов № 19 и 19а общей площадью 2832,2 кв. м. Начальная цена продажи — 5 872 225 000 (пять миллиардов восемьсот семьдесят два миллиона двести двадцать пять тысяч) рублей РБ с НДС.

Задаток в размере 2 % от начальной цены объекта перечисляется на расчетный счет ОАО «Минский приборостроительный завод» № 3012000620011 в филиале ОАО «БПС-Банк» г. Минск, код 334, УНП 100363840.

Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона.

Аукцион состоится **9 октября 2008 года** в 13.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости,

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

26
ВЕРАСНЯ
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 39 (15542)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

«У ІМЯ РОДНАЙ БЕЛАРУСІ!»

У сталіцы ў рамках Рэспубліканскага марафону «Моладзь і выбары: формула адказнасці» актывісты БРСМ прапанавалі ўсім ахвотнікам «забіць на абыякавасць», «дакрануцца да будучыні» і пакінуць пажаданне будучаму дэпутату. Акцыя прысвечана ўдзелу моладзі краіны ў выбарчым працэсе.

У акцыі «Забі на абыякавасць! Прыйдзі на выбары!» усе ахвотныя ўбівалі цвік — сімвал абыякавасці — пры дапамозе малатка ў ліст фанеры: маладыя хлопцы і дзяўчаты казалі «Так!» выбарам. У акцыі «Дакраніся да будучыні» моладзь абводзіла далоні і пісала на іх сваё імя — такім чынам усе пабачаць, што дзякуючы свайму выбару ты гатовы дакрануцца да будучыні. Таксама адразу на месцы можна было напісаць пажаданні будучым дэпутатам і апусціць іх у сімвалічную ўрну для галасавання. Дарэчы, арганізатары запэўнілі, што самыя цікавыя і арыгінальныя пажаданні знойдуць сваё месца на сайце арганізацыі і маладзёжных друкаваных СМІ.

Падобныя флэш-мобы і акцыі актывісты маладзёжнага саюза правялі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі прымае самы актыўны ўдзел у выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і праводзіць маладзёжную кампанію пад адзіным дэвізам «...у ІМЯ роднай БЕЛАРУСІ!».

«...у ІМЯ роднай Беларусі!» — гэтыя словы маюць глыбокі сэнс, таму што кожны грамадзянін у імя сваёй Радзімы вучыцца, кахае, будуе, верыць, перамагае — і гэты спіс можна бясконца працягваць... Выбіраць 28 верасня мы таксама будзем «...у ІМЯ роднай БЕЛАРУСІ!», адзначыў **сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ДАЛЖЭЎСКІ.**

Паводле яго слоў, пры кожным абласным, гарадскім, раённым камітэце БРСМ створаны штаб па ўдзеле ў выбарах. Ад маладзёжнага саюза ў склад акруговых выбарчых камісій уключаны 96 прадстаўнікоў. Такім чынам, можна без перабольшання сказаць, што БРСМ лідзіруе сярод грамадскіх аб'яднанняў. У склад участковых выбарчых камісій уключаны больш за 3 з паловай тысячы актывістаў саюза. На сёння актыўна працуюць маладзёжныя інфармацыйна-прапагандысцкія групы. Юнакі і дзяўчаты накіроўваюцца на выбарчыя ўчасткі і ў якасці назіральнікаў. Як падкрэсліў Аляксандр Далжэўскі, стаіць задача, каб на кожным участку быў прадстаўнік ад моладзі краіны.

Маладзёжная кампанія «...у ІМЯ роднай БЕЛАРУСІ!» насычана шматлікімі мерапрыемствамі: ажыццяўляецца выпуск тэматычных плакатаў, бігбордаў, іншай паліграфічнай прадукцыі, што прымушае маладых людзей задумацца: «А што робіш ТЫ?» і «А што выбіраеш ТЫ?» «...у ІМЯ роднай БЕЛАРУСІ!». Акрамя таго БРСМ праводзяцца такія праекты, як маладзёжны марафон «Моладзь і выбары: формула адказнасці», які ладзіцца ва ўсіх рэгіёнах краіны; у сталіцы і абласных цэнтрах праводзяцца флэш-мобы, а на ўчастках для галасавання актывісты саюза віншуюць тых, хто ўпершыню галасуе. Усе гэтыя мерапрыемствы закліканы запрасіць маладых людзей ды і іншых грамадзян краіны прыняць удзел у выбарах у беларускі парламент 28 верасня.

Святлана СУХАРКО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

MIR.ны рэсурс для беларускіх дзяцей

Амаль месяц прайшоў з таго часу, як пачаў функцыянаваць першы беларускі дзіцячы прававы сайт(www.mir.pravo.by.), створаны Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі па ініцыятыве Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Сайт не толькі распаўсюджвае прававыя веды, але і адказвае на юрыдычныя пытанні дзяцей, дапамагае зразумець шматлікія нарматыўна-прававыя дакументы. Дзіцячы прававы сайт задумваўся як пазнавальная гульня, цікавая не толькі для дзяцей, але і для іх бацькоў.

Ці атрымалася гэта ў яго стваральнікаў, і ў якім рэжыме прайшоў першы месяц работы сайта, раскажа **Аляксандр ГАЎРЫШ — першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі.**

— Аляксандр Мікалаевіч, раскажыце, калі ласка, як узнікла ідэя стварэння сайта?

— Ідэя стварэння дзіцячага прававога сайта звязана перш за ўсё з недахопам прававых інфармацыйных рэсурсаў, накіраваных менавіта на дзіцячую аўдыторыю. Гэта датычыцца не толькі Беларусі, але і краін былога СССР. Яшчэ адна прычына яго стварэння — прававая недасведчанасць дзяцей. Не сакрэт, што прававыя нормы цяжка зразумець нават даросламу чалавеку, і тым больш гэта цяжка для дзіцяці. Таму і нарадзілася ідэя стварыць сайт, які будзе для дзяцей гульнёй, але гульнёй інфармацыйнай.

— Стварэнне сайта — гэта выключна ініцыятыва дзяржавы ці вынік скаргаў бацькоў і настаўнікаў на недастатковую прававую адукацыю дзяцей?

— Безумоўна, у нашым грамадстве і дзяржаве даўно існавала гэтая тэма, і яна абмяркоўвалася як сярод бацькоў, так і сярод настаўнікаў. Ініцыявана ж стварэнне сайта Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у пачатку мінулага года. Менавіта таму Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі і пачаў займацца распрацоўкай сайта.

— Якія водгукі атрымаў сайт за месяц свайго існавання?

— Дарэчы, фактычна сайт працуе з 23—24 жніўня. Менавіта тады ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» праходзіла тэсціраванне сайта, дзе кожны ахвотны мог паспрабаваць гуляць, азнаёміцца з нейкай цікавай для сябе інфармацыяй. Афіцыйнай жа датай яго адкрыцця лічыцца 1 верасня. Гэта падарунак дзецям Беларусі да новага навучальнага года. Што датычыцца водгукаў, якія паступаюць на форум сайта, то яны проста цудоўныя. Дзеці і іх бацькі ў захапленні, пішуць аб тым, што гуляюць усёй сям'ёй і чакаюць працягу. Справа ў тым, што гульня прыдумана такім чынам, каб ніколі не заканчвацца. У ёй удзельнічаюць 28 персанажаў — гэта і дзеці, і настаўнікі, і міліцыянеры — тыя людзі, з якімі дзеці сустракаюцца ў рэальным жыцці. Наша задача цяпер пісаць далей сцэнарыі, калі аўдыторыі гэта спадабаецца.

— Наколькі я ведаю, беларускі дзіцячы сайт карыстаецца папулярнасцю і сярод замежных гасцей. Чым выклікана гэтая зацікаўленасць?

— Сапраўды, ужо ў першыя дні функцыянавання сайта было зарэгістравана шмат гасцей з 39 розных краін, як з блізкага, так і з далёкага замежжа. Расія, ЗША, Украіна, Літва, Ізраіль, Польшча... І гэта далёка не поўны спіс. Мяркую, што цікавасць да беларускага сайта выклікана перш за ўсё яго ўнікальнасцю. Перад тым, як пачаць яго распрацоўку, мы даследавалі падобныя праекты ў іншых краінах. Атрымалася, што хоць дзіцячыя сайты і існуюць, яны часцей носяць інфармацыйны характар і неадаптаваныя для дзіцячай аўдыторыі. Самае займальнае, што было ў такіх сайтах — наяўнасць відэа. Беларускі ж сайт адрозніваецца якраз тым, што дзеці з'яўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі падзей. У гульца ёсць магчымасць выбару таго ці іншага рашэння, і ў залежнасці ад таго, што ён выбірае, працягваецца дыялог. Плюс арыгінальныя персанажы і магчымасць змадэляваць свае ўчынкі. Прычым яны не абавязкова павінны быць правільнымі. З дапамогай гэтай гульні дзеці могуць убачыць вынікі такіх няправільных паводзінаў і выправіць іх, каб не рабіць так у рэальным жыцці.

— У рэгіёнах, а асабліва правінцыяльных гарадах і вёсках, доступ да інтэрнэту часта абмежаваны. І дзецям у гэтым выпадку цяжка не толькі даведацца пра сайт, але і карыстацца ім. Як спраўляцца з гэтай праблемай?

— Гэта таксама было прадугледжана. Да 1 верасня Міністэрства адукацыі праінфармавала школы пра створаны інфармацыйны рэсурс і парэкамендавала выкарыстоўваць яго ў працэсе адукацыі. На сайце таксама размешчана інфармацыя, як хутчэй яго асвоіць, ёсць рэкамендацыі па выкарыстанні браўзераў, каб улічваць праблему з хуткасцю інтэрнэту. Да таго ж спадзяёмся, што дзеці самі будуць дасылаць свае пытанні і пажаданні на форум сайта, а мы будзем дапамагаць іх вырашаць.

— Першапачаткова сайт быў зарыентаваны на аўдыторыю з узростам ад 6 да 16 гадоў. А якая рэальная статыстыка ўзросту наведвальнікаў сайта?

— Найчасцей сярод зарэгістраваных удзельнікаў пераважае ўзрост прыкладна ад 10 да 14 гадоў. Але праглядаючы рэйтынг гульцоў, можна заўважыць у графе «ўзрост» і лічбу 5, і 19. Да таго ж сайт часта наведваюць дарослыя людзі. Бацькам, дарэчы, таксама цікава на сайце, і яны знаходзяць для сябе шмат новага і карыснага. Напрыклад, як навучыць дзяцей правільным паводзінам на дарозе, як арыентавацца ў дарожных знаках, ці якія дакументы патрэбны для выезду за мяжу.

— Любая існуючая сістэма заўжды імкнецца да ўдасканальвання. Калі я правільна разумею, створаная версія сайта — гэта не канчатковы варыянт інфармацыйна-прававога рэсурсу. Якія новаўвядзенні чакаюць сайт у бліжэйшы час?

— Безумоўна, сайт будзе ўдасканальвацца. Гэта дазваляе рабіць сам яго праграмны прадукт. Ідэй, каб гэта зрабіць, вельмі шмат. Існуючая версія сайта — толькі пачатак таго незвычайнага, што чакае яго ў перспектыве. Напрыклад, у саму гульню будуць уводзіцца новыя персанажы, зараз іх выкарыстоўваецца толькі невялікая частка. А ў бібліятэцы з цягам часу будзе ўведзена яшчэ больш прававой інфармацыі ў даступнай і цікавай форме.

Таццяна КАВАЛЁВА.

«ТЭАТРАЛЬНЫ КУФАР» ЗНОЎ ЗБЯРЭЦЦА Ў МІНСКУ

У пачатку кастрычніка Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і ўпраўленне па справах культуры БДУ праводзяць V Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2008». Фэставая праграма адкрываецца 6 кастрычніка ўпадабанай перформанс-акцыяй «Трамвай жаданняў» і прома-шэсцем «Тэатр без межаў».

Дэвіз фестывалю — «Традыцыі. Пошук. Эксперымент». Мэтай яго з'яўляецца папулярызацыя студэнцкай тэатральнай творчасці, крэатыўная самарэалізацыя маладых людзей, духоўныя і культурныя стасункі студэнцкай моладзі Беларусі, краін блізкага і далёкага замежжа, а таксама захаванне і развіццё лепшых традыцый беларускага і сусветнага тэатра.

У свой першы маленькі юбілей «Тэатральны куфар» падрыхтаваў гледачам, гасцям і ўдзельнікам шмат сюрпрызаў і прыемных сустрэч. Збяруцца ўжо добра вядомыя і новыя тэатральныя калектывы з Беларусі, Расіі, Літвы, Эстоніі, Балгарыі, Украіны, Сербіі, Нідэрландаў, Германіі. У праграме — спектаклі паводле твораў А. Чэхава, У. Шэкспіра, Б. Нушыча, А. Макаёнка, Ф. Лоркі і іншых — усяго 21 спектакль, 20 тэатраў, каля 300 удзельнікаў — своеасаблівы рэкорд гэтага фестывалю.

У складзе журы — вядомыя тэатральныя дзеячы, педагогі, рэжысёры і крытыкі з Вялікабрытаніі, Латвіі, Славеніі, Венгрыі, ЗША, Расіі. Узначаліць журы Жан-Марк Лару (Канада), прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў, членам якой Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з'яўляецца з 2006 года.

Гран-пры фестывалю — нязменна «Прыз глядацкіх сімпатый», які ўручаецца за лепшы спектакль па выніках рэйтынгавага галасавання гледачоў фэсту.

Праект не з'яўляецца камерцыйна накіраваным, яго мэта — інфармаванне аб тэндэнцыях у сучаснай драматургіі, знаёмства з новымі імёнамі, садзейнічанне ў іх папулярызацыі. Упершыню будзе выдадзены зборнік «Бібліятэчка «Тэатральнага куфара», сёлета сюды будуць уключаны 5 найбольш цікавых п'ес беларускіх аўтараў на беларускай мове і ў перакладзе на англійскую. Удзельнікаў таксама чакае разнастайная культурная і забаўляльная праграма, якая паспрыяе больш цесным стасункам.

Кар. «ЧЗ».

ЧАРАЎНІК жалезнай краіны

Памятаеце казку «Чараўнік ізумруднага горада?». Гэта тая, дзе леў быў палахлівым, а дамкі здувала ветрам. Мяне ў дзяцінстве больш за ўсё ўразіў жалезны дрывасек, які піў масла, каб не ржавець. Я вельмі хацела сабе такога вось, жалезнага жывога сябра. Марыла, што аднойчы знайду чараўніка, які зможа яго змайстраваць.

І я яго сустрэла. Праўда, ён не зусім чараўнік, але жалезнага дрывасека зрабіць можа. Толькі калі сам захоча і да яго прыйдзе натхненне. Знаёмцеся: Васіль Цімашоў — скульптар-нефармал, мастак і проста студэнт Акадэміі мастацтваў. Яго працы ў постмадэрнісцкім стылі ўражваюць сваёй арыгінальнасцю і нестандартнасцю. Сэрца з правага боку, шыбеніца, ці клетка — не вельмі аптымістычны творчы погляд на жыццё. Але, як паказвае практыка, нешта незвычайнае і нязвыклае толькі прыцягвае грамадскі інтарэс.

— Васіль, як ты прыйшоў у мастацтва?

— Мастацтвам я цікавіўся заўжды. Маляваў, нешта майстраваў. Потым скончыў каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка па спецыяльнасці скульптура. А на спецыяльнасць гэту паступіў амаль што выпадкова. Спачатку хацеў ісці на другі факультэт, але чамусьці перадумаў. Аб чым не шкадую.

— А чаму ты выбраў менавіта выраб скульптур з металу? Наколькі я ведаю, гэта не самы лёгкі ў выкарыстанні матэрыял.

— Так, працаваць з металам нялёгка. Але гэта толькі прыцягвае. Калі адчуваеш, што простая ламачына ператвараецца ў скульптуру, і ты гэта робіш сваімі рукамі, адчуваеш сябе проста на сёмым небе *(усміхаецца)*. Насамрэч, скульптар — прафесія шматгранная. Метал — гэта сапраўды маё, тое, чым бы я хацеў займацца далей.

— Цікава, а дзе ты знаходзіш матэрыял для працы? Няўжо любая металічная ламачына можа стаць шэдэўрам мастацтва?

— З пошукам матэрыялу праблем пакуль што не было *(усміхаецца)*. Знайсці яго можна ў самых розных месцах. На спецыяльных металабазах, на звалках, куды яго выкідаюць, на сметніцах... З любога кавалка металу можна зрабіць нешта цікавае. Іншая справа, колькі над гэтым давядзецца працаваць. На кожны асобны выпадак розная колькасць часу. Нешта апрацоўваць неабходна некалькі гадзін, ці нават дзён, а нешта можна адразу ставіць у кампазіцыю.

— Як адбываецца працэс стварэння скульптур з металу?

— Спачатку я накідаю малюнак на паперы, каб не забыць, што я хацеў змайстраваць. Потым надаю металу пэўную форму, зварваю, палірую. Атрымліваецца мастацкая кампазіцыя. Хутка? *(усміхаецца)*. Насамрэч усё намнога даўжэй і складаней. Але мне гэты працэс падабаецца.

— Ты ўдзельнічаеш у нейкіх конкурсах, спаборніцтвах?

— Так. Іх, дарэчы, шмат праводзіцца. З апошніх — у пачатку жніўня браў удзел у фестывалі «Фольксваген. Пясчаныя скульптуры». Там праводзілі майстра-клас. Вопытныя, прафесійныя скульптары дзяліліся сакрэтамі майстэрства. Цікава было.

— А як людзі ставяцца да тваіх работ? Ці ёсць нейкія негатыўныя водгукі ў твой адрас?

— Зразумела, што мая творчасць не можа падабацца ўсім. Але я і не імкнуся да гэтага. Ведаю шмат людзей, якім мае работы падабаюцца. Але ёсць і іншыя, якія не разумеюць. Прымушаць некага любіць канкрэтны прадмет мастацтва, даказваць нешта — гэта не ў маім стылі. Галоўнае, што мне падабаецца тое, чым я займаюся.

Таццяна КАВАЛЁВА.

Поле для партнёрства — астраномія

Дагавор аб навуковым і даследчым супрацоўніцтве быў падпісаны паміж Белдзяржуніверсітэтам і сеткай міжнародных цэнтраў рэлятывісцкай астрафізікі (ICRANet). Дагавор прадугледжвае правядзенне сумесных даследаванняў у галіне астрафізікі, астраноміі і тэарэтычнай фізікі, арганізацыю семінараў і канферэнцый, абмен аспірантамі, вучонымі, вучэбна-метадычнымі матэрыяламі і курсамі лекцый. Партнёрства разлічана на пяць гадоў. А адно з першых сумесных мерапрыемстваў — Дні астраноміі ў Беларусі — плануецца арганізаваць на базе БДУ ў 2009 годзе, які абвешчаны Міжнародным годам астраноміі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Выпрабавана на сабе

ПРАЦА Ў АМЕРЫЦЫ: ІЛЮЗІІ І РЭАЛЬНАСЦЬ

Сумяшчаць прыемнае з карысным заўсёды цікава і займальна. Асабліва, калі гэта, здавалася б, дзве несумяшчальныя рэчы: праца і адпачынак. У такой справе вам з радасцю могуць дапамагчы. Праўда, не бясплатна. Калі вы студэнт або аспірант, то можаце скарыстацца адной з праграм. Напрыклад, самай папулярнай — Work and travel USA.

Сутнасць яе ў тым, каб даць вам працоўную амерыканскую візу і арганізаваць паездку ў ЗША.

Праграма падтрымліваецца ўрадам Злучаных штатаў, што вельмі важна. Наогул, яе сэнс — запоўніць няхватку працоўных рук у сферы абслугоўвання. Справа ў тым, што амерыканцам трэба плаціць больш, чым прыязджым студэнтам. Амерыканскім працадаўцам вельмі выгадна, каб прыязджалі іншаземныя студэнты, але потым з'язджалі пасля заканчэння сезона (што бывае не заўсёды).

КОШТ ЗАДАВАЛЬНЕННЯ

Сама праграма каштуе $795. Акрамя гэтага, трэба заплаціць $50 за паслугі беларускаму агенцтву, якое падтрымлівае гэту праграму. Плюс аплаціць амбасаду — $100, а таксама авіябілет у абодва бакі — $590.

Звычайна вылет з Кіева (+квіток да Кіева) у Парыж. І ўжо з Парыжа — у Нью-Ёрк. Большасць студэнтаў карыстаецца менавіта такім маршрутам. Вядома, ёсць і прамыя рэйсы з Мінска ў Нью-Ёрк, але і каштуе гэта значна даражэй.

— Праўда, многія не паспяваюць перасесці на самалёт у Парыжы, — распавядае Слава Гурачэўскі (БДУ, фізфак, 4-ы курс). — Студэнтам даводзіцца чакаць наступнага рэйса. У каго няма шэнгенскай візы (а такіх большасць), нельга выходзіць за межы зоны аэрапорта. Ні паесці, ні душ прыняць.

ВІЗА

Штат амерыканскай амбасады ў Мінску невялікі, таму па візы трэба ехаць у Маскву.

— Летась я таксама спрабаваў паехаць па гэтай праграме, але мне адмовілі ў візе, — гаворыць Слава. — Афіцыйная прычына — у мяне не вельмі добрыя адзнакі. Але самае галоўнае, на што глядзяць у амбасадзе — ці можаш ты патэнцыйна застацца ў ЗША. Калі ў цябе ў Беларусі ўсё добра, тады больш шанцаў атрымаць візу. Трэба з запалам дакаэаць у іншае месца. Так можна рабіць. Галоўнае — паведаміць арганізацыі, дзе ты знаходзішся. Інакш могуць ануляваць візу.

Так Слава апынуўся ў горадзе Оўшэн Сіці, штат Мэрыленд. Першы тыдзень працаваў прадаўцом марожанага ў кафэ. Але неўзабаве яго звольнілі. Не падумайце, што Слава быў дрэнным працаўніком. Проста прыехала дзяўчына, якая раней ужо працавала ў іх. Пагадзіцеся, што працадаўцам выгадней браць таго, хто ўжо прыязджаў і мае вопыт. Так пачаліся тыднёвыя пошукі новай працы.

СІТУАЦЫЯ НА РЫНКУ ПРАЦЫ

Усім вядома, што ў Злучаных Штатах цяпер эканамічны крызіс. З-за гэтага значна менш амерыканцаў ездзяць на курорты. І далей — ланцуговая рэакцыя. Працоўных месцаў у курортных мястэчках менш, чым было, напрыклад, летась. Самае галоўнае, што заробкі знізіліся. А вось колькасць студэнтаў застаецца нязменнай. І калі беларусы могуць прыязджаць толькі з чэрвеня, то, напрыклад, рускія ўжо з сярэдзіны траўня займаюць працоўныя месцы. Канкурэнцыя неверагодная. Таму працу знайсці цяпер вельмі складана.

ПРАЦЭС ПОШУКУ

За 2 дні наш герой прайшоў 170 кварталаў. Заходзіў у кожную ўстанову і пытаўся, ці патрэбныя работнікі. Такіх, як ён, было вельмі шмат.

— Часам бачыш, што за табой ідзе такі ж студэнт, — расказвае Слава, — і заходзіць у тыя ж месцы, дзе толькі што быў я. Нядзіўна, што не ва ўсіх працадаўцаў хапала цярпення ветліва адмаўляць у працы.

Пошукі працы ўсё ж увянчаліся поспехам. Славу атрымалася ўладкавацца ў рэстаран мыць посуд па вечарах. Праўда, ён знаходзіўся ў суседнім штаце (горад Фінвік, штат Дэлавер). І кожны дзень на працу даводзілася ездзіць цэлую гадзіну на аўтобусе. Па мерках вялікага горада, гэта, безумоўна, няшмат, але гэтыя гарады — далёка не мегаполісы...

Спачатку Слава працаваў 6 гадзін у дзень. Потым яму прапанавалі працу з раніцы — трэба было прыбіраць рэстаран і падрыхтоўваць прадукты для кухара (напрыклад, пачысціць агародніну). У выніку, беларускі студэнт працаваў 12 гадзін у дзень. І за кожную гадзіну працы яму плацілі $8 (для параўнання: пачак цыгарэт, у залежнасці ад штата, можа каштаваць ад $4 да $9).

Наогул кожны студэнт павінен мець два месцы. Інакш ён проста не зможа акупіць нават праграму. Пошукі другой работы — яшчэ больш складана. Калі шукаеш першую, вас задавальняе ўсё, а другая работа — толькі ў вольны час. Даводзіцца неяк сумяшчаць.

— Як праходзіў твой працоўны дзень?

— Праца пачыналася ў 8:30, таму ўставаў у 7:00. Да 15:00 працаваў. Потым па графіку дзве гадзіны перапынку і зноў на работу. Добра, што мяне ў рэстаране кармілі. Я мог папрасіць кухара прыгатаваць тое, што мне хацелася.

— А як наконт спазнення?

— Нічога страшнага ў гэтым не было. Галоўнае — трэба было да 11:00 зрабіць пэўную работу. Але наогул гэта нявыгадна, таму што ты губляеш грошы. Час жа ідзе!

— Знаходзіў час для адпачынку?

— Так. Я працаваў 5 дзён у тыдзень, таму што ў мяне не было мэты зарабіць шмат грошай. Мяне задавальняла невялікая сума, галоўнае для мяне было — не страціць лета.

— Ці ёсць розніца ў пошуку працы паміж хлопцамі і дзяўчатамі?

— Ёсць. Дзяўчат ахвотней бяруць афіцыянткамі. Тым больш вельмі шмат з факультэтаў замежных моў. У іх добрая англійская. Яны зарабляюць нармальныя грошы толькі ўжо праз чаявыя (бывае $200 за змену). А вось хлопцы да канца сезона часцей губляюць пару кілаграмаў, таму што работа заўсёды звязана з фізічнай працай. Дзяўчаты, наадварот, набіраюць вагу.

АМЕРЫКАНСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Некалькі слоў аб ілжывых і рэальных стэрэатыпах, якія дасканала заселі ў нашых галовах наконт ЗША.

Першае. У Амерыцы ўсе тоўстыя. Гэта не зусімтак. «Укормленыя» — бліжэй да праўды. У параўнанні з беларускай, у ежы там насамрэч зашмат тлушчу. Вось асноўная прычына, чаму ў амерыканцаў вялікі працэнт атлусцення сярод насельніцтва і чаму «кофты-разлятайкі» карыстаюцца вялікай папулярнасцю.

Другое. Вельмі ветлівыя людзі. Можна паглядзець на чалавека толькі дзве секунды, табе ўсміхнуцца, спытаюць як справы. І потым можна нават добрымі сябрамі стаць. «Гэта заразліва і вельмі прыемна», — распавядае Слава. — «Там гэта нармалёвы стан».

Трэцяе. Непадробны патрыятызм. Сцягі ўсюды. У нашага героя была забава — лічыць сцягі. Дык вось на квартал прыходзілася па 3-4 сцягі. А за ўсю гадзінную паездку на працу іх можна было збачыць больш за сотню.

Чацвёртае. На іншыя краіны яны глядзяць пагардліва. Амерыканцы шчыра вераць, што іх краіна лепшая за астатнія. Пры гэтым даволі цікаўныя ў дачыненні да замежнікаў.

Пятае. Амерыканцы амаль ні ў чым сабе не адмаўляюць. Ісціна.

Шостае. Паліцыя сапраўды абараняе і сочыць за законам. Усё на карысць народа.

Сёмае. На вадзіцельскія правы амерыканцы здаюць з 16 гадоў. Магчыма, таму вельмі добра водзяць машыны. Аварый значна менш, а культуры на дарозе больш.

Восьмае. Паводле слоў Славы, павага да работы ўражвае. Прытым не мае значэння, кім ты працуеш — прыбіральнікам або менеджерам. Ад гэтага не залежаць адносіны навакольных да цябе.

Дзявятае. «Амерыка — гэта сумесь культур і ў той жа час менавіта амерыканскі род жыцця застаецца нязменным. Гэта ўражвае», — дзеліцца сваімі назіраннямі Слава.

Дзясятае. Амерыканская моладзь насамрэч залішне распусканая. І па інтэлектуальным узроўні, безумоўна, саступае беларускай моладзі.

— Самае галоўнае пытанне пры знаёмстве, колькі табе гадоў, — тлумачыць Слава. — Калі 21 — у цябе класнае жыццё, калі менш — да цябе ставяцца зусім па-іншаму.

Адзінаццатае. Метро ў Нью-Ёрку і сапраўды бруднае з-за каналізацыі. Манхэтэн перанаселены. Паветра агіднае. І на гэта ёсць дзве прычыны — выхлапныя газы і смецце, якое доўга не прыбіраецца і валяецца па ўсім горадзе.

Дванаццатае. Кошт прадуктаў усюды прыкладна аднолькавы. Розніца толькі ў заробках.

ДАРЭЧЫ

— У Амерыцы ёсць правіла: пастаянна быць у руху. Амерыка — яна вельмі розная, — распавядае Слава. — Ці хтосьці гаварыў, любое меркаванне аб Амерыцы памылковае. Яна вялікая і розная.

— Ты параіў бы сябрам з'ездзіць у Амерыку папрацаваць?

— Вядома. Гэта вельмі добры вопыт працы, самастойнага жыцця, вывучэнне англійскай мовы. Акрамя працы, цікава праводзіш час, заводзіш шмат сяброў.

— Не хацеў бы застацца ў Амерыцы назаўсёды?

— Адназначна — не. Усё тут: бацькі, лепшыя сябры... Акрамя таго, гэта цяжка. Бо трэба пачынаць цалкам новае жыццё. Можаш спадзявацца толькі на сябе. Блізкіх няма побач. Мне расказвалі, як людзі ламаліся псіхалагічна. Насамрэч, гэта вельмі цяжка.

Ірына ЛЯШКЕВІЧ.



РЭКАНСТРУКЦЫЯ, ЯКАЯ НІКОЛІ НЕ КАНЧАЕЦЦА

Каб гаспадарыць эфектыўна, з прыбыткам, патрэбна ўвесь час развівацца, расці «над сабой»

На Мазырскім нафтагіганце завяршыўся першы этап рэканструкцыі вытворчасці. Што ён дае краіне і калектыву, высвятляла творчая брыгада «Звязды»

Наша газета працягвае ўважліва сачыць за працоўным рытмам калектываў, якія вызначаюць прываблівы твар індустрыяльнай Беларусі, напрамую працуюць на эканамічную бяспеку краіны.

На працягу лета з Мазыра паступалі адна за другой прыемныя навіны: на МНПЗ запушчана ўстаноўка ўтылізацыі факельных газаў, уведзена ў строй дзевяць установак алкілявання, падрыхтаваны і пачынае эксплуатацыю новы этап рэканструкцыі параўнальна маладой жывіцавытворчасці...

Час было збірацца ў камандзіроўку.

Прыехалі ў панядзелак, а на пачатку тыдня на любым прадпрыемстве «запарка», з ранку да начальства тралюць складана — праходзяць планёркі, аператыўкі, устаноўкі, устараняюць эфектыўны. Ён дае большы выхад, большы аканамны лік. У сутку выпускаем 700—800 тон нафтавай прадукцыі.

Начальнік цэха № 2 Расціслаў БАСІК.

Зручная яна і ў мэтах экалагічнай абароны, чаты-92-гі). З ураліцкай звадкавалых газаў існуюць поўнае складанасці, спажывіцоў на іх менш, дня іх транспарціроўкі патробна больш рухомага саставу. Аднак і ён больш-менш разумее эфектыўны. Ён дае большы выхад, большы аканамны лік. У сутку выпускаем 700—800 тон нафтавай прадукцыі.

Тэхналагічны ланцужок прырастае новымі прадуктамі

Мы многа раказавалі са старонак «Звязды» пра важнасць для вытворчага цыкла, для эфектыўнасці ўсяго вытворчага ланцужка комплексу каталітычнага крэкінгу, таксама здадзенага ў эксплуатацыю парэчынальна нядаўна. Дапаможнай будаваць цэх каталітычнага крэкіравання і з першага дня яго пуску ўзначаліў калектыў **Расціслаў БАСІК.** Ярказ на тэрыторыі яго цэха № 2 і здбылося ўсе тыя навіны, якія і прывялі нас цэлер на нафтаперапрацоўчы завод. Таму зусім лагічна, што мы перш-наперш сустрэліся з адным з ветэранаў вытворчасці.

Расціслаў Ігнатавіч, як заўсёды, быў дружалюбны да журналістаў, раказаў і паказаў усё, што магло зацікавіць госцу (ды не столькі нас, колькі нашага чытача. Мы даражым сваім чытачом і стараемся трымаць яго ў курсе навін).

— Ён нарэшце нядоўна сустракаліся з вамі на нашай «тытульнай» новабудоўлі — комплексе каталітычнага крэкінгу (ККК), то пра алкіраванне зусім апярэдзіна гаварыл як пра працэт тэхналагічнага ланцужка. Не толькі гаварылі, але і рабілі ўсё, каб чарговы «рэвалюцыйны» (у сэнсе тэхналогіі) праект стаў рэальнасцю.

За той кароткі час, што мы не бачыліся, тэхналогія крэкіравання, можна сказаць, устаялася, сам цэх пашырыўся за кошт новых установак. У выніку заместі звадкавалых газаў атрымліваем больш эфектыўную і дэфіцытную прадукцыю — алкілат. Гэтая бясколерная вадкасць мае свой актанавы лік і выкарыстоўваецца для развядзення бензінаў. Чым больш пампашы ў якасці, бо спажывецця характарыстыкі не самой — лепшыя. На алкілат больш спажыўцоў і цана значна вышэйшая (вышэй нават за 95-ы бензін. А звадкаваныя газы па цэне не дацягваюць і да

Начальнік цэха Расціслаў БАСІК.

вай прадукцыі.

Зручная яна і ў мэтах экалагічнай абароны, чатырохступеньчатая сістэма, якой будуецца на простым распыленні вады, альбо прымяненні ў выпадку необходнасці вадзяной завесы. Нямецкія спецыялісты прызналі нашу сістэму абаронны дасканалай. У час таго самага вялікай дзейснасці сістэма нейтралізацыі, дагазацыі адходдў, дзейнічае спецыяльная сеткаа, якая займець ца іх абясшкоджванням.

Вартая ўвагі дзяталь: у перыяд мантажу абсталявання кантроль якасці мантажу вёрсаў асабліва жорстка, бо маем справу з надзвычай агрэсіўнай кіслатой. Па нашых нормах дапускаецца 50 працэнтаў кантролю, а на гэты раз з дапамогай ультрагукавой тэхнікі адсочвалі усе 100 працэнтаў зварных стыкаў, а таксама вузлоў, дэталяў, фланцавых злучэнняў.

Алкіляванне, як вы ўжо ведаеце, з'яўляецца традыцыйнем працэсу каталітычнага крэкіравання. А з пункту гледжання далейшага працэсу тэхналагічнага цыкла можна з прапан-прапанаваай фракцыі выдзяляць у вышэй чысты прапілен. І такім чынам будзе знача пашырэны ланцужок каталітычнага крэкінгу. Прапілен патрэбен Навапалацкаму, дзе і іншым прадпрыемствам нашага канцэрна.

— Тым нядзеі, якія мы ў свой час ускладалі на ККК, апраўдаліся цалкам, — падкрэслівае наш дасведчаны суразмоўца. — А цэлер сталюючы вынік як бы падвоіваецца. Глядзіце: 800 тон алкілату ў суткі плюс сухі газ. Плюс сам бензін і лёгкі газоіль, які пасляхова рэалізуецца ў дайнім замежжі. Спачатку разлічвалі, што ён будзе выконваць толькі функцыю цепланосьбіта, а аказалася, што ён і неблагі таварэ.

Загрузка ўстаноўкі каталітычнага крэкіравання ўзрасце і складае амаль 80 працэнтаў. Прадаўж у гэтыя дні з-за рамонту абсталявання (ідзе замена каталізатара) загрузка зменшылася да 65–67 працэнтаў. Але гэта справа часовая.

Калі наладзім атрыманне чыстага прапілену і пусцім устаноўку поўнага выдалення серы з бензіну, усе цэлер будзецца, эфектыўнасць ККК яшчэ больш узрасце.

— А пуцінаая нядаўна ўстаноўка ўтылізацыі факельных газаў — не ў вашай гаспадарцы?

— А як жа, таксама ў нашым цэху. Пры не будаўніцтве выходзіві з таго, што факельныя газы з звадзісх тэхналагічных установак варта не скідаць на факел і не проста спальваць іх, а ўтылізаваць шляхам сціскання і вяртаць у зазвадкаваны стан. Гэта дазваляе не толькі ліквідаваць шкодныя выкіды ў атмасферу, але і атрымаць дадатковае паліва. Ён і ў мінулыя разы, калі мы прыязджалі ў Мазыр, выразна адчулі і ладканы вытворчы рытм гіганта айчыннай нафтахіміі.

У гэты самы час на тыднёвай планёрцы ў генеральнага дырэктара пытанні, звязаныя з кадравай палітыкай прадпрыемства. На заводзе няма складасцей з кадрамі, але яе ёсць. Такую праблему пастаянна ў цэнтры ўвагі. Тут лічаць, што без высокакваліфікаваных кадраў немагчымы забяспечыць выпуск тавараў прадукцыі належнай якасці, нават калі завод будзе ўзбоенай самым сучасным абсталяваннем і тэхналогіяі.

На чэрвеньскай сустрэчы з прадстаўнікамі прафсаюзнай пецярклічка — па ўсім комплексе праблем, якія прадпрыемцы хвалююць. І ў гэты ж самы час з берагоў Прыпяці, са старажытнага Мазыра па ўсёй Беларусі, Заходняй Еўропе і не толькі Еўропе, цэлка паўнаводная бензінавая рака. На аўтамабільныя прасторы і на экспарт ішла прадукцыя МНПЗ.

Перманентная рэвалюцыя. Тэхналагічная

Парадаўальна маладзое прадпрыемства, Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод тым не менш пастаянна развіваецца і рэканструюецца. Што яшчэ раз пацвердзіла і наша размова з Расціславам Басканам. Э'ява гэтая — рэканструкцыя ўстаноўкі АВТ «Мазырскі НПЗ» на перыяд 2006 — 2010 гадоў». Ім прадугледжана, у прыватнасці, узвядзенне магутнасцяў па вытворчасці пяраксілену. Гэты аб'ект мы ўключылі ў праграму паводпе рашэння Савета Міністраў. Цэлер ведушай падлікі эканамічнай эфектыўнасці. Пяраксілен патробен як сыравіна для магілёўскага «Кімвалакна». Але пасля змены ўлоў гаспадарання з 1 студзеня 2007 года памянялася ўся эканоміка, праект стаў эканамічна не эфектыўным, і зараз ведушая паўторная разлікі, абгрунтаванне і гэтак далей.

І, нарэшце, на чацвёртым этапе прадугледжана ўзвядзенне комплексу перапрацоўкі цяжкіх астатка. Вялізарны комплекс, прахтычна яшчэ адзін завод, ён дазаможа нам перапрацоўваць увесь астаткавы гудрон і зноў атрымлівадь з яго дызельнае паліва і іншую прадукцыю. І тады глыбіна перапрацоўкі дасяжне 92роўню і 90 працэнтаў. Амаль што поўны «фініш».

Хоць фінішу ўсё роўна не будзе. Цэлер заключаем дагавор з праектным інстытутам ЗАТ «Нафтахімпраект» з Санкт-Пецярбурга, ён будзе распрацоўваць нам праграму да 2015 года. Гэта азначае, што мы не збіраемся спачываць у сваім развіцці, будзем ісці далей, ураянець новыя тэхналагічныя працэсы, скіраваныя на далейшае паляпшэнне якасных параметраў. Прапрацоўка далейшых шляхоў, якія мы будзем рухацца (маючы на ўвазе канчатковую, фінішную перапрацоўку нафты), вядзецца ўжо цяпер.

Я называў буйныя аб'екты, а больш дробныя, такія, як розервуарныя паркі, замена печы, помпавыя і іншыя — іх вельмі многа, я на іх не спыняюся. Яны з'яўляюцца спадарожнымі аб'ектамі для асноўных. А вось пра астатках гаварыць варта, бо ён і ёсць асобна — гэта аборона экалогіі і чыстае выглядзе. Рэч цэле пра закрыты (вось у чым розніца)

На ўстаноўцы ўтылізацыі факельных газаў.

лепшых еўрапейскіх паказчыкаў. Уся прадукцыя будзе адпавядаць суседнім стандартам. Тым больш важна і прыемна, што нашы навінкі таксама чэпка ўпішваюць на экалогію.

Мы і цяпер у даводі сур'ёзных аб'ёмах прадукцыі на таким узроўні, але цалкам і ўстоліва зможам выйсці на яго толькі пасля завяршэння другога этапа. І будзем здольныя канкураваць з любым заходнім заводам. А наш стаіць не прыабдыма для нафтавых кампаній, у гранях пагыбленай перапрацоўкі нафты і далейшай рэалізацыі высакаякаснай прадукцыі.

Вас цікавіць трэці этап «Праграмы развіцця ААТ «Мазырскі НПЗ» на перыяд 2006 — 2010 гадоў». Ім прадугледжана, у прыватнасці, узвядзенне магутнасцяў па вытворчасці пяраксілену. Гэты аб'ект мы ўключылі ў праграму паводпе рашэння Савета Міністраў. Цэлер ведушай падлікі эканамічнай эфектыўнасці. Пяраксілен патробен як сыравіна для магілёўскага «Кімвалакна». Але пасля змены ўлоў гаспадарання з 1 студзеня 2007 года памянялася ўся эканоміка, праект стаў эканамічна не эфектыўным, і зараз ведушая паўторная разлікі, абгрунтаванне і гэтак далей.

Аператары тэхналагічных установак Аляксандр ЗЯНЬКОВІЧ і Уладзімір ЦЕРАХОВІЧ.

Звяняевы брыгады № 5 устаноўкі крэкіравання Мікаілай ЛІПСКІ і члены яго калектыву Сяргей НАВУМЕНКА, Валерый АНКУДОВІЧ, Уладзімір ЖУРАНОК, Вячаслаў МАРКЕВІЧ, Дзяніс КОЛАС, Уладзімір КАНАПАЦКІ і Віктар КЛІМКОЎ.

За пультам цэнтральнай аператарнай установкі алкіліравання вядучы інжынер-тэхнолаг Магамед ХАСУЕЎ і аператар Андрэй КАРАКОЎСКІ.

Дыяктар дыяркцыі па рэканструкцыі і развіцці Аляксандр ЛЯШЧЭЎСКІ.

Удасканаленню няма межы

— Установка па вытворчасці алкілату, безумоўна, новая, высокаэфектыўная, але нашы рацыяналізатары знайшлі як яе ўдасканаліць, — расказаля нам інжынер-тэхнолаг тэхадраезла Таццяна Ткачова. — Было пададзена каля 20 рацпрапаноў з мэтай як мага лепш прыстасавадь праект, выкаяаны замежнымі спецыялістамі, да нашых дзеючых умоў. Многае было зробпена, у прыватнасці, для паляпшэння ўмоў працы тэхналагічнага персаналу.

У рацыяналізатарскім руху на заводзе ўдзельнічаюць многія інжынерна-тэхнічныя работнікі, майстры, рабочыя, паведамляе Таццяна Ткачова. Іх прапановы накіраваны на эканомію сыравіны, энергарэсурсаў, зніжанне энергаёмістасці, паляпшэнне ўмоў працы.

Рэгулярна падводзяцца вынікі работы па рацыяналізацыі. Напрыклад, за мінулы год лепшымі цэхамі па рацыяналізацыі ў сваіх групах прызнаны цэх № 2 — каталітычнага крэкіравання (кіраўнік Р.І. Басік), цэх № 12 — гарапаветразабеспячэння (начальнік С.В.Тарасевіч), цэх № 10 — вымяральных збудаванняў (начальнік М.І. Нягрыш) і цэх № 22 — трамвайнае ўпраўлення (П.В. Хілько).

Групе наватараў прысвоена званне «Лепшы рацыяналізатар» і «Лепшы малады рацыяналізатар» з уручэннем грашовай прэміі.

Наватары таварна-сыравіннага цэха № 5, цэха № 2 каталітычнага крэкіравання і рамонтна-механічнай вытворчасці прызнаны пераможцамі конкурсу на лепшую рацпрапанову.

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах Яўгеній АРЦЮШЭНКА.

Аператар Ігар ЧОРНАГЛОВЫ.

На заводзе пастаянна працуюць замежныя спецыялісты. Саветнік-тэхнічны кансультант Эрнст ГРЭГАРЫ і тэхнічны кансультант Яўген ЛЯНЁЎ знаёмяцца з тэхнічнай дакументацыяй з дапамогай перакладчыцы Таццяны ТОЗІК.

— Вядома ж, мы працуем не зусім у тых умовах, якія пасля пачатку нафтаперапрацоўчая прадпрыемства на Захадзе. Пра хістанне цэны на нафту вы ведаеце, але ёсць яшчэ і цэна на нафтапрадукты, і на бяздзе для спажывіцоў яе сім іншая, больш высокая. А тамУ і нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы знаходзяцца ў іншай эканамічнай сітуацыі.

Але не будзем скарадзіцца на «грымасы рынку», як энешняга, так і ўнутранага, наглядзім лепш, як кажуць у нас у народзе, на сябе. Бо сёлеуоць і нашы ўнутраныя прычыны, якія ўплываюць на нашу эканоміку, прычым цалкам аб'ектыўныя.

На сёння чыста тэхналагічна мы пакуль не можам квалібкавана, цалкам, без астатку перапрацаваць сыравіну, якую атрымліваем ад пастаўшчыкоў. Метады выясця са станоовіна абсалютна зразумелыя — даведзенне тэхналагічнага працэсу. Але гэтае "здавальненне" каштуе надзвычай дорага, і адразу зрбе не ўхопіш.

Калі некаляі гадоў таму мы лічылі, што падбудуем комплекс каталітычнага крэкінгу і будзем жыць больш-менш спакойна, то памыліся. Узрастаюць патрабаванні да прадукцыі, да яе якасці, і гэта напрамую звязана з нашай сыравінай, якую мы можам атрымаць за свой тавар. Так што выйсце ўсё роўна ў далейшай эканамічнай сітуацыі вытворчых магутнасцяў, у тым ліку і каб прывесці ўтылізацыю серы ў нашай прадукцыі да еўрапейскіх нормаў.

Праграма рэканструкцыі да 2010 года, па якой мы сёння жывём, прайшла зацвярджэнне і нязгальным саветам, органамі дзяржаўнага кіравання, у тым ліку была зацвярджэна на прэзідыуме Савета Міністраў. Мэта яе: калі мы работаем гаварыліі — пагыбленне перапрацоўкі, то цяпер — яшчэ і даведзенне нашых прадукту да ўзроўню сусветных стандартаў. Альбо перспектыўных еўрапейскіх стандартаў.

Пытанне не ў тым, што без гэтага мы не прадаздзім свою прадукцыю. Прадаздзім, толькі па якой цане?

Так што праграма далейшага абнаўлення ёсць, буджэт гэтай праграмы — 1 мільярд 200 мільёнаў долараў. Прыкладна 500 мільёнаў долараў паявны будзем «прыцягнуць».

Адсюль і роля службы — поўнае супрацоўджэнне ўсіх інвестыцыйных праектаў, пачынаючы ад бізнэс-планавання, да эканамічнага планавання дзейнасці ўсяго прадпрыемства, фінансавага забеспячэння вытворчай праграмы. І не толькі да яе апошніх этапаў. Калі будаўнікі закончаць праект пусканаладачных работаві, то я, як фінансіст, закончаю праект апошнім пацжком па крэдыце. А гэта можа быць і праз 6-7 гадоў пасля ўводу аб'екта ў эксплуатацыю. І я маю права лічыць, што праект закончаны, калі аб'ект не толькі нармальна ўвёўся, але і акупіўся і прынёс нам дадатковыя фінансавыя рэсурсы.

Крыніцы фінансавання могуць быць розныя, — мы выкарыстоўваем і крэдыты, у тым ліку крэдыты пад гарантыі Урада Беларусі. Была вельмі арыгінальная схема на кансалідацыі сродкаў нашых акцыянераў. На сёння фактычна ўсё, што мы робім, выконваем за кошт уласных фінансавых крыніц. Прыцягваем і эбоку, але нязначна. Думаю, што асноўныя прыцягненні чакаюць нас пасля, калі будуць завершаны, разлівацца якія пойдзе з наступнага года: там мы будзем фінансаваць іншымі тэмпамі.

Эканоміка ў нас адкрытая, і тыя працэсы, якія ідуць у суветнай эканоміцы глабальна, не могуць нас не закранаць. Мы можам чакаць скарачэння інвестыцыйных патокаў. Глядзіце, што ў гэтым дне рабілася ў Расіі. Шоў каласлынны адток сродкаў з расійскага фондавага рынку. І можна чакаць, што гэта зноў адаб'ецца на нас. Будуць даражэй крэдыты альбо зменшацца іх аб'ёмы, да гэтага патрэбна быць гатовым.

Намеснік генеральнага дырэктара па персанале і сацыяльным развіцці Ірына ЛУКАШЭВІЧ.

— Мінулы год быў складаны. Як вы папрацавалі ў першай палове гэтага года?

— Калі глядзець дынамку па прыбытках, то маем такую карціну: за 2006 год — 196 мільёнаў долараў, 2007-ы толькі 35 мільёнаў долараў. Скажу, што гэта быў год выжывання для нас. Мы шукалі выйсце з непростай гаспадарчай сітуацыі, яна стварылася не па нашай вінеле. Праблемай вельмі актыўна займаўся і беларускі Урад, былі прыняты адпаведныя ўказы кіраўніка дзяржавы. Ужо са жнівня мінулага года мы пачалі стабільна працаваць. І па выніках года выканалі свае абавязкаўчэства перад дзяржавай, перад дзелавымі партнёрамі, і што не менш важна, перад уласным калектывам.

Нашаму калектыву патрэбна сказаць асобнае «дзякуй» — не было ад яго нейкіх нараканнёў, нейкіх пратастаў, незадаволенасці. Усе разумелі, што сітуацыя складаная, патрэбна проста сабрацца і працаваць. У нас нармальнае ўзаемадзеянне з прафсаюзамі, і мы, прадстаўнікі адміністрацыі, далёка не ідэальныя, але дамагаемся працаваць на выкананне пастаўленай задачы.

Гэты год і пачынаўся нялёгка, і складаўся ўдала. За сем месяцаў мы атрымалі прыбытку 85 з лішнім мільёнаў долараў прыбытку. На дынаміцы лічбы відаць, што сітуацыя нейкім чынам наладжваецца, і мы адчуваем сябе больш упэўнена.

«Маніторынга» не толькі эканоміка

Многае з таго, пра што мы гутарылі з кіраўніком эканамічнай службы прадпрыемства, знайшло свой працэт у расказе наступнай нашай суразмоўцы — **начальніка аддзела кадраў прадпрыемства Аксаны ЯРМАК.**

— Мы аналізуем кадравы склад свае службы, і ў якасці прыкладу магу прывесці такі факт. Амаль адна трэць завадскіх (32,8 працэнта) — людзі з вышэйшай адукацыяй. А калі браць і тых, хто працуе і вучыцца на завочных аддзяленнях ВНУ, то лічба вырастае да 38 працэнтаў. Гэта вельзарны інтэлектуальны патэнцыял. Такі калектыў здольны вырашаць самыя складаныя задачы.

Аналіз кадравага складу фінансава-эканамічнай службы паказаў, што ўсе не кіраўнікі і спецыялісты маюць вышэйшую прафільную адукацыю, а ярказ палова мае нават дзве вышэйшыя адукацыі — тэхнічную і эканамічную. Амаль палова знаходзіцца ў самым працаздольным узросце — ад 31 да 40 гадоў, амаль трэць — у пары творчай сталасці (ад 41 да 50 гадоў). Нягуч, калі аналізаваць з пункту гледжання наяўнасці вопыту, то фактычна ў палавы вытворчы стаж работы на прадпрыемстве — ад 10 да 25 гадоў і больш. Гэта надзвычай моцны спецыялісты.

Тым не менш кіраўніцтва службы клапоціцца, каб пастаянна ўліваліся «маладая кроў». Дасыя праказаюць, што прыцягне кожныя пяць гадоў адбывацца істотнае абнаўленне кадраў.

Кадравая палітыка на прадпрыемстве ажыццяўляецца пад рэальнам патрабы вытворчасці і будуецца з улікам стратэгіі развіцця выпрацоўкі. Адным з асноўных яе накіруюцу ярказ і з эўрэзвеяда далейшае павышэнне адукацыйнага ўзроўню персаналу — павышаюся ў здзяненне на прадпрыемстве новых перадавых тэхналагічных працэсаў і абсталявання. За апошнія гады колькасць работнікаў з вышэйшай адукацыяй павялічвецца на ўсіх катагорыях, але галоўным чынам сярод рабочых і кіраўнікоў. Чаму сярод кіраўнікоў — у прынцыпе зразумела. А вось сярод рабочых таму, што гэта рабочыя не ў традыцыйным разуменні, а перавазна аператары складаных тэхналагічных установак, аператары ЭВМ, прыбараністы, спецыялісты па абслугоўванні і рамонце высокатэхналагічнага абсталявання.

У апошні час мы пачалі праводзіць маніторынг сацыяльна-працоўных адносінаў на прадпрыемстве. Ён уключае ў сябе аналіз усёй інформацыі — і статыстычнай, і той, што паступае з рабочых месцаў, ярказ скіравана на аказанне падтрымкі перш за ўсё народнай адукацыі, установам аховы здароўя, на развіццё спорту ў гарадзе, на добраўпарадкаванне гарадскіх вуліц. Вось літаральна зараз за завадскія грошы абуладкоўваецца вуліца Мінскую — будуецца новая праезная частка ўздоўж грамадзянскіх пуцей, вы бачылі самі. Мы аддалі на гэтую работу адзін мільярд дзевяце мільярдаў рублёў. Адной падшэфнай школе перапілі 220 мільёнаў, другой падшэфнай школе — таксама 220 мільёнаў. Нашым дзіцячым садкам, якія цяпер перададзены на баланс гарада, таксама выдзелілі сродкі. Не было мінулага года, каб мы ім матэрыяльна не дапамаглі. Вось і сёлета кожны дзіцячы садок атрымаў па 70 мільёнаў рублёў, каб штосьці абновіць, закупіць абсталяванне, цацкі. Выдзелілі сродкі на набыццё новага медыцынскага абсталявання нашым установам аховы здароўя.

Зрабілі надзвычай вялікі ўклад у развіццё спорту — з мінулага года пачалі фінансавадь спачатку праект будучага Палаца спорту. Яго яшчэ называць Цэнтрам здароўя, што таксама правільна. І сёлета ўжо прынята рашэнне перапілець гэты з паловай мільярдаў на пачатак будаўніцтва. Магчыма, назіральны савет прыме рашэнне, якое потым падтрымаюць акцыянеры, каб выдзеліць на гэтыя мэты дадатковыя ячэ 10 мільярдаў.

У мінулыя гады мы аддавалі грошы — прыкладна 6 альбо 8 мільярдаў — на абуладкаванне гарадскоі гарнальнай трасы, ці ізмаравага корпуса. Зараз там ужо многае зроблена, і мы пераключаемся на падтрымку фінансавання спартыўнага комплексу. Там мяркуецца зала гульнявых відаў спорту з аранай на дзве тысячы чалавек і залы для заняткаў ушкай атлетыкай, боксам, барацьбой і іншымі відамі спорту. Плюс аэробіка, зала для боўлінгу на шэсць дарожак, басейн, а ў дадзіным — аквапарк і гасцініца. Вось у які праект мы будзем укладваь свае сродкі, маючы на ўвазе, што будуецца палац для завадскі і іх сем'яў, для ўсяе жыхароў горада, у якім мы жывём і працуем.

Хачу заўважыць, што ўсё гэта разам узятае — выніх прыбытковай дзейнасці МНПЗ.

Пуск года

І на заканчэнне свой ка мкентарый зрабёў **генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» Анатоль Аляксандравіч КУПРЫЯНАЎ.**

— Сёсны — да Новага года ён яшчэ будзе прымаць адалачаваных, затым закрыем і будзем цэлы год яго рэканструяваць. У выніку у нашай здраўнішцы застанецца толькі дакументсная нумерацыя. І Беларусо па ўсёй краіне будзе ведаць, што ў нас адбыўся пуск буйнага аб'ёмнага, буйнамаштабнага тэрытарыяльнага, больш сучаснай стане архітэктуры будынка.

Ва ўсім, што датычыцца дабрабыту людзей, мы стараемся захаваць тыя добрыя традыцыі, якія ў нас ужо склаліся. Дапамагаем, напрыклад, свам працаўнікам будаваць уласнае жыллё. Існуе цэлая праграма, якая так і называецца — «Жыллё». Думаю, што без ажыццяўлення ў завода не было б перспектывы далейшага развіцця. Людзям, у першую чаргу малазабяспечаным і дзяцям, важна не толькі зарабіць сродкі на жыццё і своечасова атрымаць зарплату, але і мець дах над галавой. Для нашых людзей праз КІЗы і пры падтрымцы банка будуецца прыкладна сто кватэр у год. Гэта не дзяржаўныя крэдыты, а крэдыты, якія забяспечаны прыбыткамі Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода. Цэлер завяршэння ўзвядзенне 108-кватэрнага дома, на наступны год фарміруюцца KI3 з 80 чалавек. Перспектыва будавадзь з нашай дапамогай свою кватэру з'яўляецца надзвычай стымулам для малодзеі.

Вам жо сёння раказалі і паказалі, што праграма развіцця прадпрыемства, прынятая на перыяд да 2010 года і зацвярджаная прэзідыумам Савета Міністраў Беларусі, рэалізуецца паспяхова. Вельмі важна, што першы этап рэканструкцыі паспяхова завяршыўся ў жніўні пускам комплексу па выпуску высокаякаснага экалагічна чыстага кампанэнту для вытворчасці бензінаў еўрапейскай якасці. Для ўзвядзення комплексу алкіліравання спатрэбілася 147 мільёнаў долараў ЗША. Акрамя таго, алкілат можа экспартавацца і як самастойны таварны прадукт, які карыстаецца вялікім попытам за мяжой.

Комплекс алкіліравання працуе на новай тэхналогіі, з прымяненнем у якасці каталізатара фторыставадародной кіслаты, у СНД нямаа нафтаперапрацоўчых заводаў з аналагічнай тэхналогіяй.

У адзнаку да таго, што вам раказалі, можна зазначыць, што вытворчасць алкілату з'яўляецца высокарэнтабельнай. Разлікоая прадукцыйнасць устаноўкі — 315 тысяч тон прадукцыі ў год. Цэлер кожныя сутні атрымляюць 700 тон, што адпавядае прыкладна 75 працэнтам ад праектнай магутнасці ўстаноўкі. Аб'ект гэта складаны, у яго казфіцыент складанасці — 10. Ва ўстаноўцы каталітычнага крэкіравання, для параўнання, ён раўняецца 6. Абсталяванне і матэрыялы тут павінны быць самай высокай якасці, з самай высокай ступенню надзейнасці, каб цалкам выключыць магчымасць негатыўнага ўздзеяння аб'екта на тэхналагічны персанал і навакольнае асяроддзе.

Але гэта адзін з важнейшых этапаў на шляху да дасягнення еўрапейскай якасці прадукцыі. Варта напомніць, што на шляху да гэтай мэты мы ўвялі ў канцы 2006 года ў эксплуатацыю яшчэ адзін важны аб'ект — комплекс па вытворчасці бензіну, які дазволіў знізіць утрыманне бензолу ў аўтабензінах да ўзроўню менш за 1 працэнт, як таго і патрабуюць еўрапейскія стандарты якасці.

Паралельна вядзецца работа, звязаная з далейшай рэканструкцыяй прадпрыемства — будаўніцтвам чатырох новых установак, не лічачы агульнаазводскіх аб'ектаў. Пробы будуе пабудаваць магутныя ўстаноўкі гідраачысткі дызельнага паліва і гідраачысткі бензіну каталітычнага крэкінгу, па вытворчасці вадароду і ізамерызацыі пентангексанавай фракцыі. У другі этап рэканструкцыі ўкладзена ўжо прыкладна 50 працэнтаў неабходных сродкаў. Вось яго рэалізацыі і дазволіць нам, разам з іншымі лепшымі нафтаперапрацоўчымі заводамі Еўропы, выйсці да 2010 года на перадавыя рубяжы па ўзроўні нафтаперапрацоўкі і якасці выпускаемай прадукцыі.

Ведучыя праектныя работы, рэалізуюцца падпа атрыманні крэдытных ресурсаў і для наступных этапаў рэканструкцыі нашага прадпрыемства.

Напрыканцы нашай размовы ўслед за калегамі, бо гэта важна, хачу ніжа раз падкрэсліць, што ўсе пытанні, звязаныя з выкананнем калектыўнага дагавора, як у вытворчай, так і ў сацыяльнай сферы, выконваюцца. Заработная плата на заводзе ўстойліва расце. Дарэчы, прагнозныя паказчыкі па зарплаце, устаноўленыя бізнэс-планам, да канца года могуць быць перавышаны.

Асаблівасці вытворчай праграмы гэтага года: плануем выйсці на 10 мільёнаў 900 тысяч тон перапрацоўкі нафты ў год. Патэнцыял прадпрыемства — 12 мільёнаў тон, ён будзе запатрабаваны пасля завяршэння другога этапа рэканструкцыі завода, у другой палове 2010 года, калі завод будзе збалансаваны па сваіх магутнасцях. Мэтада на ўвазе баланс прарэчных і другасных прадукцый.

Што не менш важна — працягваецца мадэрнізацыя дарожнай устаноўкі. Гэта дастаткова работа: рэканструкцыя, мадэрнізацыя, тэхнічнае пераўзбраенне, бо прадукцыя — неадзельная адзін ад другога. Гэта ўсё дазволіць нам, як нам здаецца, вырашыць і ў наступны год атрымаем бясстратную работу ў расліваодстве. Збіраемся ўжо сёлета пабудаваць свінагадоўчы комплекс на 12 тысяч галоў, а ў наступным годзе запусціць для яго гаталоўе пародзістых элітных свіней, каб арганізаваць высокарэнтабельную вытворчасць свінінны. Так што прыязджайце наступнай вясной на «Палессе Агрэінвест», мы пакажам, што паспелі зрабіць для яго развіцця.

Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАСНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).
Выказпытаны таксама здымкі з архіва прадпрыемства.

***Ад рэдакцыі.** Творчая брыгада «Звязды» выказвае шчырую падзяку начальніку сацыяльнага аддзела прадпрыемства Вользе Кулыба, кантралёру шматпрыладнай гаразы «Мозырскай нафтаперапрацоўчык», а таксама намеснік начальніка аховы аб'екта Георгію Пракапенку за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.*

Індустрыяльны пейзаж, які цешыць вока.

канструкцыі завода. ТамУ перад эканамічнай службай пастаўлена дакладная задача — прыняць рашэнні для накіравання фінансавых патокаў такіх мэтавітых рэканструкцыя прадпрыемства. Іх задача — правільна выбраць прыярытэты для эканамічна абгрунтаванага развіцця інвестыцыйнай дзейнасці прадпрыемства. А таксама знаходзіць дастаткова вялікія аб'ёмы грашовых сродкаў для фінансавання закупак сыравіны, рэзервовых запасаў, таксама сыравіны, якога зберагаюць ад пашэння тоўсць ходзім да аптымальнага, як нам здаецца, вырашэння. Думаю, што на наступны год сэнсе падыходзіць да аптымізацыі работы яго малочнатавараных ферм. Малако на 50 працэнтаў рэалізуецца гатункам «Экстра», і маленькая Галіна прыносіць аграрнаму прадпрыемству неблагую выручку. Цэлер намаганні скіраваны на тое, каб узняць эфектыўнасць расліваводства. Бальнасць зямлі ў іх невысокая, гэта сапраўдная зона рызыкоўнага земляробства. Таму мы перагледелі структуру пасеваў, вызначылісь, што будзем сабадзіць надалей, і у гэтым сэнсе падыходзім да аптымальнага, як нам здаецца, вырашэння. Думаю, што на наступны год атрымаем бясстратную работу у расліваодстве. Збіраемся ўжо сёлета пабудаваць свінагадоўчы комплекс на 12 тысяч галоў, а ў наступным годзе запусціць для яго гаталоўе пародзістых элітных свіней, каб арганізаваць высокарэнтабельную вытворчасць свінінны. Так што прыязджайце наступнай вясной на «Палессе Агрэінвест», мы пакажам, што паспелі зрабіць для яго развіцця.

Генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» Анатоль КУПРЫЯНАЎ.

Аператары Арцём МАРКЕВІЧ і Уладзімір КАНЮШКОУ.

Аператар Іван ЛУКАШЭВІЧ рыхтуецца да аднаўлення кіслата асяроддзя.

Завяршылася працоўная змена.

Выбары-2008

ПОГЛЯД ЗБОКУ

У размове з міжнароднымі назіральнікамі паспрабуем атрымаць аб'ёмнае ўяўленне аб электаральных працэсах у Беларусі

Да знакавага дня, асноўнай даты парламенцкіх выбараў — 28 верасня — засталося ўсяго нічога. Час, як кажуць, збіраць камяні... А хто ж можа даць больш аб'ектыўную ацэнку, чым той, хто глядзіць збоку? Толькі старонняму назіральніку бачныя ўсе ўдзельнікі падзей і толькі старонняму назіральніку нішто не замінае цвяроза ацэньваць сітуацыю, бо прыватнага інтарэсу ў яго няма. Таму па высновы мы звярнуліся да такіх вось старонніх назіральнікаў, якія праводзілі маніторынг перадвыбарных працэсаў у нашай краіне. Прапануем вам тыя самыя погляды з боку, а дакладней, з двух бакоў. І змяшчаем іх разам — для поўнай карціны.

З поглядам місіі БДІПЧ АБСЕ, прадстаўленай больш як 350 назіральнікамі, знаёміць яе кіраўнік — пасол Герт АРЭНС.

З поглядам місіі СНД, якая ўжо сёння прадстаўлена больш чым 400 назіральнікамі з сямі краін СНД (а ў хуткім часе папоўніцца і мноствам каротказачасовых назіральнікаў), знаёміць Наўрыз АЙДАРАЎ, намеснік старшыні выканкама СНД, кіраўнік штаба назіральнай місіі СНД.

Н.А. — Галоўная задача арганізатараў выбараў — стварыць найлепшыя ўмовы для свабоднага волевыяўлення грамадзян, — падкрэслівае суразмоўца. — Сёння можна сцвярджаць, што арганізатары выбараў у Беларусі зрабілі і робяць максімум магчымага для таго, каб гэта задача была рэалізаваная. Па-першае, Рэспубліка Беларусь загадзя зрабіла запрашэнні міжнародным назіральнікам для ўдзелу ў маніторынгу выбараў. Гэта вельмі важна — прыгадаем сітуацыю ў Расіі, калі менавіта з-за тэрмінаў удзел міжнародных назіральнікаў ад БДІПЧ АБСЕ стаў немагчымым. Па-другое, пры Цэнтрвыбаркаме створаны Назіральны савет для кантролю за выбарамі, за падтрымліваннем парадку ў ходзе агітацыі. Па-трэцяе, прыняты Дэкрэт кіраўніка дзяржавы, паводле якога ў склад ЦВК з правам дарадчага голасу ўвайшлі прадстаўнікі партый. Па-чацвёртае, старшынёй Вярхоўнага Суда былі прынятыя адпаведныя дакументы распарадчага характару для таго, каб максімальна забяспечыць законнасць пры падрыхтоўцы, правядзенні выбараў і непасрэдна ў дзень галасавання. Па-пятае, кіраўнік МУС аддаў даручэнне максімальна забяспечыць парадак падчас выбарчых працэсаў.

Мы адзначаем пры гэтым, што выбары праходзяць у спакойнай палітычнай абстаноўцы. Наяўнасць такіх пазітыўных момантаў дае нам права адчуваць сябе даволі ўпэўнена і спакойна.

НА АДПАВЕДНАСЦЬ ЗАКАНАДАЎСТВУ

Г.А. — Усе скаргі мы абавязкова адсочвалі. У нашай камандзе ёсць прававы аналітык, які прысутнічаў на пасяджэннях Цэнтральнай выбарчай камісіі, а таксама на пасяджэннях Вярхоўнага Суда. Большасць скаргаў датычылася адмовы грамадзянам у рэгістрацыі іх кандыдатамі ў дэпутаты. Скардзіліся і ўжо зарэгістраваныя кандыдаты — такія звароты паступалі з Гомеля, Брэста (дарэчы, я наведваў гэтыя гарады): напрыклад, на тое, што іншыя кандыдаты сустракаліся з выбаршчыкамі ў больш «выгадных» месцах, чым яны. На няроўнасць правоў кандыдатаў скардзіліся і ў Мінску, гэта былі кандыдаты ад апазіцыі. Мы рэгулярна сустракаліся з прадстаўнікамі апазіцыі і будзем сустракацца напярэдадні выбараў. Мы таксама імкнуліся сустрэцца з як мага большай колькасцю кандыдатаў, не звязаных з апазіцыяй, і прадстаўнікоў партый, якія не лічаць сябе апазіцыйнымі. Напрыклад, я сустракаўся з лідарамі абедзвюх камуністычных партый — спадарыняй Голубевай і спадаром Калякіным, каб атрымаць збалансаваную карціну.

Герт Арэнс адзначыў, што падчас назірання былі выяўлены выпадкі, якія мяжуюць з сур'ёзнымі парушэннямі. У прыватнасці, калі сушукальніку адмаўляюць у рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты, бо ў сваёй дэкларацыі ён не ўказаў нейкую нязначную маёмасць, якая ўжо многія гады яму не належыць. «І ў большасці выпадкаў сітуацыю вырашалі дастаткова сурова, — падкрэсліў Герт Арэнс. — Тое ж датычылася і падпісных лістоў. Я нават абмяркоўваў гэта са старшынёй Вярхоўнага Суда... Аднак хачу запэўніць, мы тут не для таго, каб вышукваць нейкія моманты для крытыкі. Мы з задавальненнем адзначаем і станоўчыя моманты.

Аднак па вопыту назіральніка асноўныя парушэнні адбываюцца, як правіла, у дзень галасавання, а таксама пасля закрыцця выбарчых участкаў. «І я спадзяюся, што гэтага не здарыцца», — дадаў кіраўнік назіральнай місіі ад АБСЕ.

Н.А. — Работа назіральнай місіі СНД — ацаніць, наколькі выбарчае заканадаўства Беларусі адпавядае міжнародным стандартам. Адзначу, што вельмі шмат пазітыўнага ў гэтым плане. Нават той факт, што Рэспубліка Беларусь сёння праводзіць працэдуру далучэння да Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, якая прынятая ў СНД, яшчэ раз падкрэслівае — дзяржава робіць максімум для таго, каб па выніках парламенцкія выбары былі прызнаныя дэмакратычнымі, свабоднымі, транспарэнтнымі, справядлівымі. Падчас выбарчага працэсу могуць сустракацца разнастайныя парушэнні, у першую чаргу парушэнні выбарчага права, да якіх мы, вядома ж, вельмі скрупулёзна падыходзім. Гэта датычыцца таго, як праходзіць працэс рэгістрацыі кандыдата, фарміравання спісу кандыдатаў у дэпутаты, якія ўмовы створаныя для ўчастковых камісій — там, дзе непасрэдна будзе праходзіць сам працэс выбараў, ці ўсё зроблена для таго, каб кожны грамадзянін Беларусі мог свабодна выказаць сваё меркаванне, аддаўшы голас за таго ці іншага прэтэндэнта.

Кіраўнік штаба місіі СНД падкрэсліў, што відавочных сур'ёзных парушэнняў, якія б засталіся ў сіле, назіральнікамі не было заўважана.

— А тыя сітуацыі з парушэннямі, якія сапраўды пацвердзіліся, былі выпраўленыя рашэннем Вярхоўнага Суда, — дадаў ён. — Той, як ісціна ў апошняй інстанцыі, мае права даваць адказ. І менавіта Вярхоўным Судом былі адмененыя два рашэнні аб адмове грамадзянам у рэгістрацыі іх кандыдатамі ў дэпутаты. І мы перакананыя, што нейкія тэхнічныя памылкі і іншыя недарэчнасці не маглі паслужыць бар'ерам для таго, каб той ці іншы прэтэндэнт стаў кандыдатам у дэпутаты. Тут жа такая сітуацыя — няхай пасля народ абярэ сярод іх. Наогул усе структуры, якія так ці інакш садзейнічаюць правядзенню выбараў, робяць усё для таго, каб да мінімуму звесці нейкія негатыўныя моманты.

НА АГІТАЦЫЙНУЮ КАМПАНІЮ

Г.А. — 28 верасня выбары пройдуць не толькі ў Беларусі, але і ў Аўстрыі, і ў паўднёвай частцы Германіі — Баварыі. І там выбарчая кампанія праходзіць значна больш дынамічна. Аднак варта браць у разлік пэўныя гістарычныя ўмовы развіцця гэтай краіны. Скажам, роля палітычных партый у Беларусі куды меншая, чым у Аўстрыі. Само па сабе перадвыбарнае зацішша не з'яўляецца парушэннем, калі толькі яно не створана штучна. Ды і ўсё ж такі нешта адбываецца, напрыклад, сёння, калі выходзіў з дому, я заўважыў плакат спадара Калякіна «Галасуйце за змяненні». Адносна цяжкая выбарчая кампанія абумоўлена не толькі гістарычнымі працэсамі ў краіне, але і строгімі правіламі, у адпаведнасці з якімі можа праходзіць выбарчая агітацыя. Напрыклад, невялікая сума дзяржаўных сродкаў, якія могуць выкарыстоўваць кандыдаты для агітацыі. Кандыдаты могуць выступаць у СМІ, аднак у дастаткова нязручны час. Месцы для сустрэч з выбаршчыкамі і размяшчэння агітацыйных матэрыялаў вызначаюцца дзяржавай. Я не хачу сказаць, што пералічаныя моманты з'яўляюцца парушэннямі выбарчага заканадаўства. Аднак увогуле яны робяць выбарчую кампанію дастаткова абмежаванай у магчымасцях экспрэсіі. На гэту тэма можна доўга філасофстваваць... Ёсць, напрыклад, краіны, дзе трэба быць вельмі багатым чалавекам, каб мець магчымасць узяць удзел у выбарах. Мне ў прыватнасці гэта не дазволіла б паўдзельнічаць у выбарчым працэсе. Таму галоўнае, здаецца, — давер грамадзян да выбараў. Я бываў у краінах, дзе гэты давер практычна адсутнічае, і не пытайцеся, якія гэта краіны, — не скажу! *(смяецца)*. Згадаю толькі сваю радзіму — Германію, там бывае ўсялякае, аднак людзі тым не менш вераць у тое, што выбарчы працэс праходзіць справядліва. Калі я апускаю бюлетэнь у выбарчую ўрну, я ўпэўнены, што мой голас будзе залічаны менавіта той партыі, за якую я прагаласаваў. І менавіта гэты момант крытыкуецца апазіцыйнымі палітыкамі ў Беларусі. Што зноў-такі вяртае нас да праблемы назірання за падлікам галасоў.

Улічваючы, што выбары ў Беларусі праводзяцца не па прапарцыянальнай, а па мажарытарнай сістэме, гэта надае ім істотны мясцовы характар, — заўважыў пасол. Таму выбарчая кампанія ў нашай краіне, на яго думку, хутчэй, не адна, нацыянальная, а 110 мясцовых выбарчых кампаній.

Н.А. — Падрыхтоўка да выбараў праходзіць у вельмі свабоднай абстаноўцы, і мне здаецца, кандыдатам грэх скардзіцца на тое, што ім надаецца недастаткова ўвагі, што яны ў горшых умовах, чым хтосьці іншы. Любому чалавеку, які паводле заканадаўства мае права выставіць сваю кандыдатуру ў склад вышэйшага заканадаўчага органа краіны, даецца магчымасць ім скарыстацца. Дзяржава ідзе на любыя просьбы і прапановы міжнароднай суполкі, напрыклад, патрэбны дадатковы эфірны час — калі ласка. Таму, здаецца, драматызаваць сітуацыю няварта. Скажу толькі, што з кожным годам усім тым, хто марыць папоўніць шэраг дэпутатаў, становіцца ўсё цяжэй прапанаваць новыя шляхі вырашэння праблем. Проста цяжка спаборнічаць з тым цвёрдым устойлівым курсам кіраўніцтва краіны. Ну і па звычайнай практыцы кандыдатамі, як правіла, становяцца тыя людзі, якія ўжо недзе сябе праявілі — тыя, каго ведаюць па добрых справах. Ці то прадстаўнікі працоўных калектываў, ці той, хто вылучыўся сам, аднак у сваім асяродку заслужыў давер суседзяў і знаёмых. Агітацыя — гэта безумоўна, патрэбны і сур'ёзны працэс, аднак у фінале выбаршчык усё роўна галасуе за таго, хто, мабыць, і не так удала загітаваў, але здолеў пераканаць, што менавіта ён і толькі яго праграма на сёння могуць быць рэальна карыснымі для людзей.

Паўтаруся, вельмі цяжка сёння вынесці нешта на суд выбаршчыка, каб менавіта агітацыя стала знакавай як такая. Я лічу, беларускі выбаршчык даўно ўжо вызначыў для сябе кандыдатаў. Спадзяюся, гэта будуць сапраўды тыя годныя прадстаўнікі, перад якімі стаіць вельмі сур'ёзная задача па працоўванні іміджу Беларусі на міжнароднай арэне. Тутэйшы парадак, спакой, дабрабыт — гэта тая візітоўка краіны, якой трэба ганарыцца, аб якой трэба заяўляць.

НА БЕЗАЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ АКРУГІ

Г.А. — Калі ў акрузе толькі адзін кандыдат, само па сабе гэта не з'яўляецца парушэннем выбарчых стандартаў, — запэўніў пасол. — Проста выбары праходзяць куды цікавей, калі ёсць элемент спаборніцтва. А таксама калі людзі бачаць магчымасць рэальнага выбару.

Н.А. У наяўнасці акруг, ад якіх балатуецца толькі адзін кандыдат, місія СНД не бачыць ніякай трагедыі. «Безальтэрнатыўнасць гэтая, хутчэй, не столькі ад пасіўнасці ўдзельнікаў выбарчага працэсу, колькі, мабыць, ад адсутнасці альтэрнатывы існуючай у краіне лініі, якая большасць насельніцтва, відаць, задавальняе», — выказаў меркаванне кіраўнік штаба місіі.

НА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ З ІНШАЙ МІСІЯЙ

Г.А. — І ў місіі АБСЕ, і ў місіі СНД — свая метадалогія. Аднак я хацеў бы падкрэсліць, што мы не нейкая «заходняя» місія. Усе краіны ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў з'яўляюцца таксама і ўдзельніцамі АБСЕ. Сярод нас ёсць доўгатэрміновыя назіральнікі з Расіі, яны працуюць у Брэсце, Гомелі і Лідзе. Будуць расіяне і сярод каротказатэрміновых назіральнікаў. Адносіны паміж дзвюма місіямі — сяброўскія, мы знаёмыя ўжо доўгія гады. У дзень выбараў я звычайна сустракаўся са спадаром Рушайлам, сёлета гэта будзе сустрэча са спадаром Лебедзевым. 28 верасня мы параўнаем вынікі нашага назірання. Мы прадстаўляем дзве розныя місіі, кожная з якіх прыйдзе да сваіх высноў. Аднак прынцыпы, па якіх мы ацэньваем выбары, фактычна аднолькавыя. Выбарчыя стандарты, прынятыя ў АБСЕ, падтрымалі ўсе краіны — удзельніцы АБСЕ, а значыць, і ўсе краіны СНД. Канвенцыя аб стандартах дэмакратычных выбараў краін — удзельніц СНД ужо ратыфікаваная некаторымі членамі АБСЕ, напрыклад, Расіяй. Аб сваім далучэнні заявіла і Беларусь.

Н.А. — Місія назіральнікаў СНД сёння дастаткова аўтарытэтная арганізацыя, — адзначае суразмоўца, — са сваімі правіламі і метадыкай. Вось ужо сем гадоў, як гэты інстытут стаў пастаянна дзеючым. Мы праводзілі маніторынг у 10 краінах. 8,5 тысячы прадстаўнікоў дзясятка дзяржаў СНД прымалі ўдзел у маніторынгу. У Беларусі, дарэчы, сфарміраваная 42-я місія. Вось гэтая арыфметыка дае мне права сцвярджаць, што прафесіяналізм быў, ёсць і будзе ў аснове работы нашай місіі. Нашы ацэнкі заўсёды былі збалансаванымі, аб'ектыўнымі, мы ніколі не ўкліньваліся ў справы замежных дзяржаў, усе свае ацэнкі давалі выключна на ўласным матэрыяле — тое, што на свае вочы ўбачылі, тое і зафіксавалі. Тая адкрытасць, у якой мы працуем — я маю на ўвазе і сустрэчы з прадстаўнікамі СМІ — арыентавана таксама на тое, каб павысіць давер да місіі СНД не толькі міжнароднай суполкі, але і беларускага насельніцтва. Сёння ў місіі АБСЕ і СНД назіраецца ўзаемны інтарэс. Апошнія два-тры гады наша ўзаемадзеянне было больш актыўным, і па многіх параметрах у выніковай ацэнцы нашы назіранні супадаюць. Мы рэальна пераконваемся ў тым, што адрозненні калі і ёсць, то звязаныя яны выключна з методыкай работы. Калі раней місіі назіральнікаў рабілі большы акцэнт на нейкіх чыста тэхнічных умовах — своечасовасць адкрыцця выбарчага ўчастка, факты знаходжання двух і больш выбаршчыкаў у адной кабіне, то сёння наша ўвага сканцэнтраваная на выніковым моманце любых выбараў — падліку галасоў. І вось калі тут будзе забяспечана празрыстасць і адкрытасць, калі місіі назіральнікаў СНД і АБСЕ атрымаюць доступ да самой працэдуры падліку галасоў, гэта і будзе асноўным крытэрыем ацэнкі выбараў. Традыцыйна мы атрымлівалі такую магчымасць, таму нейкіх прычын для непакою няма. Праходзяць сустрэчы і на ўзроўні кіраўнікоў місій, і на ўзроўні экспертаў, і ў мяне ёсць такое інтуітыўнае пачуццё, што нашы выніковыя ацэнкі будуць... не скажу, што ідэнтычнымі, аднак вельмі падобнымі... Усё вырашыцца 28 верасня!

Аднак самае цікавае мы прыхавалі на салодкае. Падчас нашай гутаркі кіраўнік штаба місіі СНД выказаў нечаканую прапанову — аб'яднаць намаганні абедзвюх місій:

— Мы ўносім прапанову, якую, дарэчы, ужо агучылі місіі БДІПЧ АБСЕ і над якой яна, між іншым, працуе: над работы паралельнымі курсамі перайсці да адзінай ацэнкі, працаваць, мабыць, у адной камандзе — проста місія міжнародных назіральнікаў. Сам той факт, што сёння місія БДІПЧ АБСЕ мае вялікую колькасць прадстаўнікоў СНД у сваім складзе — гэта ўжо адзін крок насустрач нашай прапанове. А мы прапануем пайсці далей, выпрацаваць адзіныя падыходы, своеасаблівыя шаблоны, адзіныя крытэрыі — гэта будзе справядлівым прынцыпам ацэнкі. Вучобу праводзіць таксама сумесна, канвенцыю зацвердзіць адзіную. Быць не толькі кантралёрамі, але і нейтральнымі памочнікамі, каб выбары сапраўды былі свабоднымі, справядлівымі, адкрытымі, якімі іх хочуць бачыць не толькі ў Беларусі, але і ў свеце.

Ала МАЧАЛАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объектов республиканской собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

Наименование предмета аукциона	Здание блока цехов и право заключения договора аренды земельного участка	Здание инженерного корпуса и право заключения договора аренды земельного участка	Здание бытового корпуса со столовой и право заключения договора аренды земельного участка	Здание центральной заводской лаборатории и право заключения договора аренды земельного участка	Железнодорожный подъездной путь и право заключения договора аренды земельного участка
	Не завершенные строительством объекты				
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., г. Дрогичин, ул. Ленина, 204				
Продавец недвижимого имущества	РУПП «Экзон – Глюкоза», г. Дрогичин, ул. Ленина, 204, тел. 01644 2 10 25				
Сведения о предмете аукциона	Здание блока цехов – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 3,5915 га, срок аренды – 99 лет	Здание инженерного корпуса – степень готовности 55 %. Земельный участок площадью 1,1671 га, срок аренды – 99 лет	Здание бытового корпуса со столовой – степень готовности – 55 %. Земельный участок площадью 1,0089 га, срок аренды – 99 лет	Здание центральной заводской лаборатории – степень готовности 50 %. Земельный участок площадью 0,9081 га, срок аренды – 99 лет.	Ж/д подъездной путь – длина 2,1 км, ширина –1,51м. Земельный участок площадью 2,5513 га, ограничения в охранных зонах линий электропередач, трубопроводов и иных инженерных сооружений, срок аренды – 99 лет.
Условия аукциона	- использование объекта для осуществления предпринимательской деятельности; - создание и регистрация на территории Дрогичинского района юридического лица; - создание не менее 20 новых рабочих мест в 2009 году; - при организации производства, требующего соблюдения санитарной зоны, обеспечение выноса действующих складов РУПП «Экзон-Глюкоза» и РУП «Экзон» за пределы производства; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи	- использование объекта для предпринимательской деятельности, создание не менее 3 новых рабочих мест в 2009–2010 гг.; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи			
Начальная цена предмета аукциона, руб.	164 121 660*	53 356 880*	46 129 120*	41 953 350*	87 015 037*
Сумма задатка, руб.	16 412 000	5 335 000	4 612 000	4 195 000	8 701 000
Организатор аукциона	*Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. 0162 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63. www.brest-region.by*				

** определена как сумма начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены продажи права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины начальная цена предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.*

Аукцион состоится **28 октября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие следующие документы:

заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015, филиал № 100 ОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

3. Юридическим лицом – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

4. Индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

5. Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

6. Представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

7. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

8. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Возможно предоставление рассрочки по оплате за право заключения договора аренды земельного участка.

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае рассрочки), возместить расходы по формированию и государственной регистрации земельного участка; возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 27 октября 2008 года включительно.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.03	18.58	11.55
Віцебск —	6.52	18.47	11.55
Магілёў —	6.53	18.48	11.55
Гомель —	6.49	18.45	11.56
Гродна —	7.18	19.13	11.55
Брэст —	7.18	19.14	11.56

Месяц

Апошняя квадра.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Дзмітрыя, Сямёна, Фёдара, Ульяна.*

К. *Амелії, Аўрэлії, Святаполка, Сяргея, Уладзіслава.*



Дзве даты

26 верасня

Сёння — еўрапейскі дзень моў, які праводзіцца з 2002 года пры падтрымцы Камісіі па адукацыі ЮНЕСКА з мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці да важнасці вывучэння мовы, а таксама палепшыць уяўленне аб усіх мовах, якія культывуюцца ў Еўропе.

1942 год — гітлераўцы нанеслі другі цяжкі ўдар па мінскім падполлі, пачаўшы новую хвалю масавых арыштаў, у час якіх былі схоплены і кінуты ў засценкі СД сотні падпольшчыкаў. Большасць з іх загінула на шыбеніцах і ў лагерах смерці.

1968 год — пасля паражэння «пражскай вясны» ў газеце «Правда» надрукавана так званая «дактрына Брэжнева» аб «абмежаваным суверэнітэце сацыялістычных краін».

Цытата дня:

«Там, дзе больш за ўсё небяспекі, — больш за ўсё і надзеі».

Альбер Камю (1913—1960), французскі пісьменнік.

Усміхнёмся!

Маладзенькая медсястра пытаецца ў доктара:

— Віктар Сяргеевіч, а мы нагогул "Хуткая дапамога"?

— Вядома, Машачка!

— А чаму ж мы сёння нікому не дапамаглі?

— Затое прыязджалі хутка!

☺

Як прыемна ўсё ж прачнуўшыся ў суботу раніцай, пасля сэксу з мужам, знайсці на тумбачцы каля ложка 100 долараў!

☺

Маленькі хлопчык звоніць да суседа і, калі той адчыняе дзверы, кажа:

— Мама загадала перадаць вам, што тата сышоў на рыбалку, а я буду гуляць у двары ў пясочніцы...

☺

Калі муж вашай палюбоўніцы ўсміхаецца пры сустрэчы і горача трасе вам руку, значыць на наступным спатканні вы гарантавана пачуеце ад яе фразу: "Мілы, я нарэшце вольная. Ты са мной ажэнішся?"

☺

Цешча капошыцца каля машыны перад домам. Зяць з акна:

— Мама, куды гэта вы сабраліся?

— На могілкі, сынок.

— А хто машыну потым дадому прыгоніць?



ПАНЯДЗЕЛАК, 29 ВЕРАСНЯ

5.25 «Мастакі, скульптары, паэты». «Арман. Партрэт скульптара».
6.20, 7.05, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.45, 7.45, 18.50, 1.05 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.25, 11.55 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 14.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05 «Жыццё як жыццё». «Якой я буду свекрывёй?».
11.00, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Меладрама «Сіняя барада».
13.55 Здароўе.
14.25 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Культурныя людзі.
16.05 «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Прымадонна».
21.00 Панарама.
21.45, 1.10 Серыял «Часткі цела».
23.00 Драма «Ярды».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00. 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.00 Контуры.
10.05, 11.10 «Цудоўная пяцёрка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
11.20 Тэорыя неверагоднасці. «Калі верыць у лёс».
12.00 Малахаў+.
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.05 «Кантрольная закупка».
14.40 «Джуманджы».
15.05 Серыял «Чорны крумкач».
16.15 «Бітва гарадоў».
17.40 «Жарт за жартам».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Серыял «Ленінград».
23.25 «Зваротны адлік». «Песняры. Беларускі цуд».
0.00 «Звычка жаніцца».
1.10 Футбол. Чэмпіянат Бразіліі. Сан-Паула — Крузэйро.
3.30—5.00 Прафілактыка.
5.05 «Няхай гавораць».

6.45 Серыял «Прыгоды Скіпі».
7.10 Ранішняя падзарадка.
8.10, 17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
8.30 Серыял «Справа была ў Гаўрылаўцы-2»
10.50 У гэты дзень.
10.55, 16.10 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
11.40, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.35 Дак. серыял «Зоркі кіно». Жуст Жакен.
13.35 Гаспадар.
14.05 Тэлебарометр.
14.25 Мультфільм.
14.35 Мультсерыял «Добрай раніцы, Мікі Маус!».
15.05 Пазакласная гадзіна.
15.15 Школа рамонту.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Сышчыкі раённага маштабу». 1-я серыя.
19.55 Беларуская часінка.
20.55 Калыханка.
21.15 Экспедыцыя.
21.20 Серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана».
23.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
0.00 Хакей. Формула гульні.
0.25 Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Экстраліга. «Юнацтва» (Мінск) — «Нёман» (Гродна).

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае снеданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.40 Наша справа».
10.50 Серыял «Жыццё працягваецца».
11.45, 18.25 Серыял «Трое супраць усіх 2».
12.35 «Ваенная тайна».
13.50 «Мой дом».
14.20 «Здаровае дзяцінСТВа».
14.30, 0.05 «Крутыя рабяты».
15.00 «Зоркі спорту».
15.30 «Я — падарожнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.30 «Званая вячэра».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Русалка».
23.00 Серыял «Салдаты. Дэмбельскі альбом».
0.00 «Закон і крымінал».
0.15 «Сталічны футбол».
0.45 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05, 7.05, 1.20, 2.40 Садружнасць live.
5.30 Дак. серыял «Вяселлі на мільён долараў».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.30, 19.20 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.45 Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Снежная каралева».
12.05, 23.30 Маст. фільм «Стрэл на перавале Караш».
14.05 Мультсерыял «Паўторная загрузка 1-2».
14.30 Серыял «ОБЖ».
15.20 «Дзіўнае жыллё».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 4.00 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 «Акцэнты».
18.30 Серыял «Мядовы месяц».
20.05 «Спрэчная тэрыторыя».
21.20, 3.00 Серыял «Астрог. Справа Фёдара Сечанава».
22.30 Дак. фільм «Кома — гэта праўда».

7.00, 10.50, 16.55, 19.45 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 21.05, 23.35 «Метэапрагноз».
7.30 Маст. фільм «Ніколі не здавайся».
9.00 «Клуб-700».
9.20 «К-гульні».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.50 Серыял «Шпіёнка».
11.00 Маст. фільм «Сям'я Кардзье».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Мультпарад».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Трылер «Выганяючы д'ябла».
23.20 «Кіно-кліп-парад».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.10 Пакой смеху.
10.30 «Падарожжы натураліста».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30 Маст. фільм «Біндзюжнік і кароль».
13.35 Мультфільмы.
13.50, 16.50, 18.50, 23.20 Навіны—Беларусь.
14.20, 22.25 «Кулагін і партнёры».
14.55 Серыял «Рамэо і Джульета».
15.55 Суд ідзе.
17.25 «Сумленны дэтэктыў».
17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».
19.30 Серыял «Чараўніцкае каханне».
20.25 Серыял «Бухта страху».
21.25 Серыял «Канвой PQ-17».
23.00 «Весткі+».
23.30 «Я старым не буду. Драма Вампілава».

7.00 «Добрай раніцы, Расія!».
10.00, 17.25, 0.25 Серыял «Родныя людзі».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Жанчына без мінулага».
11.25, 15.05 Мультфільмы.
11.45 Маст. фільм «Ідзі і не азірайся».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Час радасці».
15.15 «Гарадское кунг-фу».
16.25 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 0.10, 6.40 Весткі-спорт.
16.55, 5.40 «Пецярбургскія салоны».
19.45, 1.55 Серыял «Чараўніцкае каханне».
20.30, 3.45 Серыял «Дзве сястры».
21.15, 4.50 «Аб чым маўчаў казачнік? Яўген Шварц».
22.00 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.20 «Паміж сваімі сувязь жывая...». Уладзімір Лакшын.
23.00, 4.30 «Весткі+».
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Начны палёт»

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Агляд».
9.30 «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.35 Баявік «Белае золата».
15.05 «Прафесія — рэпарцёр».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».

16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.45 Серыял «Закон і парадак».
20.50 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў-9».
22.30 Серыял «Праклятыя рай».
23.40 Серыял «Лічбы».
0.30 «Школа зласлоўя».
1.20 «Прафесія — рэпарцёр».

5.00 Канал «Настрой».
7.30, 17.15 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
7.35, 14.30, 18.55, 19.55, 2.10, 3.30 Маст. фільм.
9.20 «Доказы віны». «Беспредельщики».
